Мельнік ☞ 3



Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

МІКОЛА ЦЭТРА ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 36 (2521) Год XLIX | Беласток, 5 верасня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

Улады ў рамках палітыкі Еўрасаюза абавязаны адкупіць ад гаспадароў, пачынаючы з 1 лістапада, усю прапанаваную пшаніцу, ячмень і кукурузу. Аднак збожжа будзе купляцца ў аднародных партыях (толькі пшаніца ці ячмень) — мінімум па 80 тон...

Добры ўраджай

Доўга ў гэтым годзе трэба было чакаць, пакі даспела збожжа і камбайны выехалі на поле. Малацьбу адтэрмінавалі летні холад і дажджы.

Калі ў сонечны дзень адправіўся я ў напрамку Кляшчэляў, мусіў тармазіць, каб абмінуць камбайн. Камбайнер Рыгор Троц з Карыціск прыязджае малаціць у Істок і суседнія вёскі, а гаспадары за гэта яго хваляць.

— Дажджы не зашкодзілі збожжу, можа крыху бульбе. Каб толькі не было граду, то ўраджай павінен быць добры. Думаю, што па тры тоны жыта з гектара павінна быць, — гаворыць Ян Хомчук з Істока. Гадуе ён яшчэ 4 каровы. Прыстасаваў хлеў да еўрасаюзных патрабаванняў і карыстаецца даільным апаратам. Аднак не ведае, ці доўга яшчэ будзе гаспадарыць. Сыны рашыліся на гарадское жыццё і выехалі ў Гайнаўку. У Істоку ёсць толькі некалькі гаспадароў, якія займаюцца гадоўляй кароў. У Славаміра Мінюка — 15 кароў, а ў Пётра Люнды — 8. Іншыя, найчасцей старэйшыя гаспадары, гадуюць толькі па некалькі штук быдла. Яшчэ нядаўна касілі збожжа снопавязалкамі, але зараз наймаюць камбайнераў.

Едучы пазней па дарозе ў Кляшчэлі заўважыў я, што жыхары Істока хутчэй справіліся са жнівом, чым жыхары іншых вёсак. У тых мясцовасцях, дзе гаспадары пасеялі больш ярай пшаніцы і мяшанкі, малацьбу адтэрмінавалі дажджы.

— Гэты год у Гайнаўскім павеце быў спрыяльны для расліннай прадукцыі, бо часта ішлі дажджы. Прадбачваем, што ў сярэднім плён збожжа будзе вышэйшы за мінулагодні на 20%. Можа на якасна лепшых землях у Чыжоўскай ці Гайнаўскай гмінах ураджай будзе набліжаны да мінулагодняга. На слабейшых землях у Дубіцкай ці Кляшчэлеўскай гмінах плён будзе намнога вышэйшы, бо недахоп дажджу ў прошлых гадах выдатна панізіў там плён, — кажа Геронім Панятоўскі, кіраўнік Сельскагаспадарчага дарадчага калектыву ў Гайнаўцы.

Многія гаспадары ў мінулых гадах рашаліся адразу прадаваць частку змалочанага збожжа. У гэтым годзе няма даплатаў з дзяржаўнага бюджэту да скупкі зерня. Польскія ўлады ў рамках супольнай палітыкі Еўрасаюза абавязаны адкупіць ад гаспадароў, пачынаючы з 1 лістапада, усю прапанаваную пшаніцу, ячмень і кукурузу. Аднак паяўляецца перашкода, якую для выдатнай большасці гаспадароў цяжка будзе пераадолець. Збожжа будзе купляцца ў аднародных партыях (толькі пшаніца ці ячмень) — мінімум па 80 тон.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Рыгор Троц з Карыціск малоціць у суседніх вёсках

— Прадбачваецца скупка збожжа па 101 еўра за тону (450-460 злотых). Аднак сапраўдная цана будзе паменшаная з-за сырасці і забруджанасці збожжа. У Гайнаўскім павеце будзе каля дзесяці гаспадароў, якія змогуць са свайго поля выдзеліць 80 тон аднароднага збожжа для продажу. Гаспадары павінны аб'ядноўвацца ў вытворчыя саюзы, якія маюць большыя магчымасці, каб атрымаць дафінансаванне з еўрасаюзных фондаў. Аднак цяжка пераканаць нашых сялян да калектыўнага дзеяння. Гаспадары будуць вымушаны прадаваць збожжа пасрэднікам, — інфармуе Геронім Панятоўскі. — У краінах Еўрасаюза амаль не сеюць жыта і таму яго скупка за дзяржаўныя сродкі не прадбачваецца. Замянілі яго там кукурузай, якая з'яўляецца больш якасным кормам.

Зараз без абмежаванняў купляе збожжа суполка „Элевар" з Бельска-Падляшскага, але прапануе невысокія цэны — 451 злоты за тону пшаніцы і 325 злотых за тону жыта. Рыхтуецца да скупкі збожжа прадпрыемства „Фармпаш" з Макаўкі і індывідуальныя прадпрымальнікі.

— Цана на збожжа мела быць вышэйшай у час жніва. За дзяржаўныя сродкі мелі купляць толькі тое збожжа, якое гаспадары не змогуць прадаць за рынкавую цану. Аднак відаць, што ёсць інакш. Прадпрыемствы, якія рашыліся купляць збожжа, апасаюцца даваць высокую цану на яго, каб пасля не дакладаць да скупкі і коштаў перахоўвання, — гаворыць Ніна Сахарчук, старшы спецыяліст па справах прамоцыі Гайнаўскага сельскагаспадарчага дарадчага калектыву.

Прадбачваецца скупка збожжа па 101 еўра за тону (450-460 злотых). Аднак сапраўдная цана будзе паменшаная з-за сырасці і забруджанасці збожжа. У Гайнаўскім павеце будзе каля дзесяці гаспадароў, якія змогуць са свайго поля выдзеліць 80 тон аднароднага збожжа для продажу...

— Вышэйшыя цэны на свініну і ялавічыну могуць спрычыніцца да большай мясной прадукцыі і да большага запатрабавання на кармавое збожжа. Калі не будуць купляцца вялікія колькасці збожжа з іншых краін, цана на яго можа яшчэ павысіцца. Абмежаваннем для імпарту збожжа могуць быць кошты яго транспарту, — разважае Геронім Панятоўскі.

У час жніва на рынку ў Гайнаўцы было мала збожжа. Мінулагоднюю пшаніцу гаспадары хацелі прадаць па 55-60 злотых за цэнтнер, ячмень — па 50-55 злотых, жыта — па 42 злотых. Аднак вельмі мала было ахвотных купляць за такую цану. Тыя, якім трэба купляць збожжа на корм, чакаюць ажно калі гаспадары прывязуць свежае і таннейшае.

Аляксей Мароз

Сабачы хлеб ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Сённяшняя дзяржаўная палітыка ў дачыненні да чалавека мае наступныя мэты — адных запалохаць ці „купіць", іншых (іншадумцаў), тых, хто не скарыўся, не стаў халуём і прыслужнікам, пераўтварыць у ізгояў. Самыя моцныя рэпрэсіі супраць іншадумцаў не грашовыя кары ці турэмныя суткі, а тое, што з іх робяць „пракажоных"...

Паломніцтва ☞ 2

Аляксандр Вярбіцкі

Святая Гара звонку абведзена вяночкам рознага роду грэшных спакушэнняў. Ёсць там прылаўкі, з якіх прапануецца не толькі пякельная інструментальная музыка, але і відэазапісы такіх сцэн, якія адбываліся ў суседстве праведнага Лота...

Ва Украіне ☞ 5

Ганна Кандрацюк

У манастыр мы дабраліся на другі дзень падарожжа, на зыходзе дня. На месцы заначавалі ў прыватнай кватэры (два долары за начлег). Яшчэ ў той самы дзень мы памыліся, надзелі спадніцы і хустачкі ды пайшлі ў Лаўру. Трэба было спяшацца: ужо ў дзесяць вечарам зачыняюць уваходную браму і ўсе цэрквы...

Санька ☞ 8

Міра Лукша

— Пабачыць мяне маглі ў Сан-Антоніо з самбрэра на галаве і доўгім cigarillo ў вуснах, як працую пры пабудове маста. Спаткаць мяне можна было ў Токіо, як маклера суднаплаўнай лініі, як ем рыс палачкамі, ці пад гарачым небам Аргенціны, дзе лес валю ці гадую жывёлу. Як ламаю „чорныя дыяменты" ў шахтах Францыі ды Бельгіі...

Спадчына Кваса ☞ 8

Васіль Сакоўскі

Паявілася ў нас добрая мода перадаваць прыватныя архівы, бібліятэкі ці часткі іх у Гайнаўскі беларускі музей. Ужо перададзены кнігазборы Мікалая Гайдука, Дзядзькі Кваса і многіх іншых. Там яны не прападуць і не будуць забыты, а выкарыстаны нашымі ж людзьмі...

Беларуская пагроза ☞ 9

Яўген Міранові́ч

Каб не дапусціць да вайны паліцыя арыштавала ў Вільні 50 беларусаў, абвінавачваючы іх у арганізацыі антыпольскага падполля, выдаванні нелегальных газет на беларускай мове, планавай дэмаралізацыі польскага грамадства за замежныя грошы, прапагандзе кампраметуючай польскую ўладу. Усе палітычныя клопаты на Віленшчыне...

9 770546 196000

Сабачы хлеб

Паехала група беларускіх настаўнікаў у Польшчу. Сустрэліся з калегамі, пазнаёміліся, абмяняліся вопытам, пагаварылі пра школьныя праблемы. Словам, з'ездзілі падчас адпачынку да суседзяў у госці, запрасілі тых, з кім пасябравалі, да сябе. Здавалася б, звычайныя чалавечыя зносіны. Але не. Праз месяц тэлефануе аднаму з удзельнікаў візіту дамоў ягоны дырэктар школы і пагрозліва пытае, чаму той займаецца... палітыкай. Што тут скажаш?! Хоць у пляжны валейбол гуляй, калі турнір арганізавала недзяржаўная структура — адразу палітыка.

Гісторыя тыповая для сённяшняй Беларусі. Але пра што задумваешся. Відавочна, што дырэктар школы не пільнуе кожнага свайго настаўніка па-за школай, ды яшчэ ў летнія вакацыі. Значыць гэта „праца" спецслужбаў, якія адсочваюць літаральна ўсё, потым „падаюць звесткі" ў адпаведныя ўстановы, тыя сваім парадкам у аддзелы народнай адукацыі, тыя мусяць адпаведна рэагаваць і так далей. Маленькая ланцуговая рэакцыя чалавечай ганьбы. Але які велізарны штат стукачоў паводле прафесіі і „шасцёрак" паводле пакліканння мусіць утрымліваць дзяржава!?

Страх, стукацтва і халуйства ляжаць у аснове сённяшняй дзяржаўнай ідэалогіі, якую імкнуцца прышчапіць у Беларусі. Вера людзей у ленінізм, сталінізм, камунізм і іншыя „-ізмы" сканала ў масавай свядомасці ў канцы васьмідзесятых — пачатку дзевяностых, калі магутная інфармацыйная хваля праўды адкрыла вочы мільёнам людзей, душы якіх дзесяцігоддзямі калечыла савецкая прапаганда. Інфармацыйная прастора так пашырылася, што сёння таталітарны рэжым не ўкараніш на сляпой веры. Толькі на свядомым страху і вынішчэнні іншадумства. Але аднаму ці дзесяці чалавекам здзейсніць такое не пад сілу. Патрэбныя, як казалі бальшавікі, „кіпучыя гейзеры народнай творчасці".

Але ідзем далей у нашай гісторыі. А далей дырэктару школы загадваюць любым чынам звольніць настаўніка за ўдзел у недзяржаўнай навуковай канферэнцыі, а дырэктару завода звольніць інжынера за ўдзел у „няправільным" святкаванні „няправільнай" даты. Дырэктар перажывае, цэлую ноч „пакутуе" на згрызоты сумлення. Але загад ёсць загад, яго трэба выконваць. А то звольняць ужо яго самога. А можа не звольняць? Але ж могуць. А яму ж трэба карміць сям'ю. І дырэктар выконвае загад. Праз паўгода ўжо па сваёй ініцыятыве звальняе яшчэ аднаго „ненадзейнага" супрацоўніка, бо ў яго скончыўся тэрмін кантракта. А далей ужо можна спакойна працаваць. Дырэктар і думаць не хоча, што корміць сваю сям'ю не старанай адміністрацыйнай працай, а коштам таго, што ён звольніў сумленных людзей, забраў хлеб у іх малых дзяцей, беспрацоўных жонак, хворых бацькоў.

Потым, калі ў дзяржаве шмат пераменіцца, такія кіраўнікі будуць казаць, што яны былі шчырыя ў сваіх „памылках", што час раскрыў ім вочы. І ўсё валіць на аднаго чалавека. Таго, хто сёння кідае ім сабачы хлеб. Хлеб не толькі за рабскую паслухмянасць, не толькі за халуйства. Бо ад такіх канфармізму і здрады чалавечай годнасці толькі адзін крок да подласці. Безумоўна, не кожны яго зробіць. Але нешта не чуваць пра ўчынкі элементарнай грамадзянскай мужнасці сярод мноства чыноўнікаў і кіраўнікоў рознага кшталту і роўню. Таму так і жывём, падзеленыя на „чэсных" і „нячэсных".

Сённяшняя дзяржаўная палітыка ў дачыненні да чалавека мае наступныя мэты — адных запалохаць ці „купіць", іншых (іншадумцаў), тых, хто не скарыўся, не стаў халуём і прыслужнікам, пераўтварыць у ізгояў. Самыя моцныя рэпрэсіі супраць іншадумцаў не грашовыя кары ці турэмныя суткі, а тое, што з іх робяць „пракажоных", людзей, для якіх няма месца нідзе. Той, каго звольнілі ці пазбавілі працы з-за ідэйных перакананняў, добра зведаў, што гэта такое. Дзяржава хоча знішчыць іншадумца перш за ўсё псіхалагічна, зламаць яго волю. Але ўсе гэтыя спецслужбоўцы, „господа-офицеры" (дзе іх хвалёны гонар?), чыноўнікі не могуць зразумець адной рэчы. Таго, што чалавеку як паветра патрэбная свабода. Таго, што годнасць не пусты гук. Таго, што жыццё без іх нічога не варта. Няўжо ім так салодкі смак сабачага хлеба?..

Уладзімір Хільмановіч

Паломніцтва

Жнівень з'яўляецца ў нас месяцам паломніцтваў. Яны прыцягваюць шмат народу. Колькасць іх, як паведамляюць сродкі масавай інфармацыі, вялікая, а якасць поўная адухоўленасці; інакш меркаваць, на маю думку, нават не выпадае.

Паехалася мне, значыць удалося паехаць, на Грабарку. Пад свята Спаса яна нагадвае свайго роду алегорыю маніхейскага бачання свету, дзе Дабро суіснуе са сваім антонімам. Сама Святая Гара звонку абведзена вяночкам рознага роду грэшных спакушэнняў. Ёсць там прылаўкі, з якіх прапануецца не толькі пякельная інструментальная музыка, але і відэазапісы такіх сцэн, якія адбываліся ў суседстве праведнага Лота. Кружыць там наймалодшае пакаленне, якое перспектыву ўзнагароды за паломніцкі высілак бачыць у неадкладна ўспрымальных цацках ці марожаным. Падросткі вырываюцца туды каб пасля напружанага адухаўлення расслабіцца на мове блокерсаў. Сустракаюцца і бабулькі, якія на прывязцы водзяць лунаючыя папяровыя — як у мааісцкай касмалогіі — тыгры, сувеніры ўнучанятам. І над гэтым вяночкам лунае арамат жараных каўбас і шашлыкоў — выпрабаванне на паломніцкую спакусу ў постны час.

Нягледзячы на адсутнасць адмысловага нагляду, на гэту скарыміну няма аматараў. Большасць дарослага народу на малебене за адмяжоўваючым ад спакус мурам. Мабыць шмат-хто, падганяемы гадамі да мэты, асэнсоўвае нематэрыяльную ўжо перспектыву ўзнагароды за паломніцтва. Сямейныя групкі прысутнічаюць у калектыўнай малітве ў зацені дрэў.

Мужчына каля сарака гадоў вымае з партфеля фотаапарат і робіць здымкі сваім узрадаваным адухаўленнем сямейнікам. І жанчына з групкі побач прыгадвае, што і ў ейнай сумцы такая ж прылада. І яна шчоўкае сваёй, пасля сяброўка падмяняе яе, а пазней той згаданы саракагодак ветліва здымае паломніц іхнім апаратам. Уласніца, трыумфальна ўзрадаваная, хавае камеру ў сумку. Грэшным недаверкам раскажа і пакажа, дзе яна была прысутная і з кім. Будуць доказы і сведкі. Страшны суд не страшны. Рай.

З пачаткам пропаведзі сямтам зрух. Спрактыкаваныя вернікі ведаюць ужо яе напоўнены духоўнасцю змест як малітву. Але гэта ж не малітва, а хутчэй між імі перапынак, ёсць нагода сюды-туды заглянуць, распрастаць косці.

Вяртаюся на аўтобусе з групай паломнікаў. Недалёка мяне засела жанчына ачэпленая золатам; сваім вонкавым і ўнутраным багаццем нагадвае яна мне пралата Янкоўскага, сваімі думкамі размашыста дзеліцца са спадарожнікамі.

Галоўная яе заклапочанасць — адзенне. Магчыма, што яна ткачыха, магчыма, што краўчыха, магчыма, што тэолаг-тэарэтык. Дачуваюся, што святары нашы не надта ведаюць, як павінна апранацца жанчына-праведніца і адзежная прасветніца часта настаўляе іх на дарогу збаўлення. У ейным прыходзе матушка падыходзіць да аналоя ў спадніцы з распоркам — што тады тварыцца ў мужчынскіх галовах, якія такую спакусу назіраюць!

Дзён пару пазней бачыў я, як мне здалося, тую матушку, зусім праведна апранутую і з пункту гледжання аўтобуснага абітурыента заключыў, што ў калектыўнай малітве прысутнічаць павінны толькі тыя жанчыны, якія займаюцца цяжкаатлетычным спортам або прынамсі на такіх выглядаюць. А ўсе тыя, што захавалі закладзеную ў цела райскай Евы спакуслівую прывабнасць контуру, павінны аставацца дома.

Да аўтобуснага абмену думак падключаліся і іншыя жанчыны. А паколькі так склалася, што не былі яны паміж сабою блізка знаёмымі, тады гутарка не зыходзіла на іншых супольна знаёмых ім жанчын, на якіх прыкладах можна было б паказаць розныя грэшнасці. Гутарка ішла пра супольныя жаночыя страсці — вопратку. Што вопраткай закрываць, а што можна паказваць для агляду. Час ад часу размова кіравалася ў бок нейкага калектыўнага грэшніцтва.

— Калісь, — заключыла адна з паломніц — хату можна было закрыць затычкай і ніхто нічога не вынес. А цяпер кватэру трэба замыкаць на салідныя замкі. Усё гэта пачалося з таго часу, калі сталі паломнічаць у тую Чанстахову!

Аляксандр Вярбіцкі

Вачыма еўрапейца

Трывалае партнёрства

Прымаў я нядаўна ўдзел ва ўрачыстасці падпісання інтэнцыйных лістоў аб назначэнні чарговай адміністрацыйнай ініцыятывы, якая мае дапамагчы ў барацьбе з беспрацоўем на Падляшшы. Праграма называецца Мадэль лакальнага партнёрства (MPL). Шэсць старостаў, м.інш. гайнаўскі, паразумеліся пісьмова наконт яе ажыццяўлення. Урачыстае падпісанне дамовы адбылося ў палацы Браніцкіх, у прысутнасці шматлікіх чыноўнікаў. Меў быць таксама пасол ЗША ў Варшаве. Гэта з ім маршалак меў падпісаць той найважнейшы інтэнцыйны ліст, у справе рэалізацыі MPL, падтрымліваны Ведамствам працы ЗША і рэалізаваны ў Польшчы пад патранатам прэзідэнта Аляксандра Кваснеўскага. На жаль, пасол не дабраўся, бо на той момант стары з'ехаў ужо з амбасады, а новы яшчэ не ўручыў прэзідэнту вярыцельных грамат. І хоць можна было, вядома, імпрэзу адтэрмінаваць, пачакаць, каб сталі правамоцнымі інтэнцыйныя лісты новага амерыканскага дыпламата, урачыстаць была праведзена. Маршалак лістамі абмяняўся не з паслом, а з краёвым каардынатарам праграмы Ядвігай Альшоўскай-Урбан. Тая, дарэчы, на ўцеху сабраным, звярнулася да маршалка зваротам прыналежным якраз паслам і біскупам: Wasza Ekscelencjo. Можа, гэта нейкае прароцтва? Мяне, аднак, больш цікавіла, што беспрацоўныя будуць мець з тае праграмы, якая афіцыйна стартавала якраз цяпер у актавай зале палаца. Даведаўся, слухаючы прамоў з трыбуны і пераглядаючы інфармацыйныя буклеты аб тым, што самі жыхары павінны ствараць рынак працы (таксама попыту і збыту) на месцы, на тэрыторыі старостваў ды павінны ўзнікаць групы сяброўскай падтрымкі беспрацоўных. Таму ўсяму мае служыць тое, што ёсць існасцю MPL: абучэнні. Падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі і ваявода Марэк Стшалінскі ў адзін голас, у час амаль гадзіннай урачыстасці, прамаўлялі словамі быццам рэха даўняе эпохі:

— Праграма адцісне эфектыўны ўплыў на ўзроўні грамадскага і гаспадарчага жыцця ў рэгіёне. Гэта надзея для людзей, якія захоўваюць гатоўнасць да працы. Ажывіць актыўнасць лакальнай грамадскасці.

У адной інфармацыі я прачытаў: „MPL ставіць сабе за мэту будаванне трывалага партнёрства паміж урадавымі ўстановамі, мясцовымі прадпрыемствамі, самаўрадам і няўрадавымі арганізацыямі ды жыхарамі мясцовай грамадскасці — дзеля эканамічнага ажыўлення і паправы сітуацыі на рынку працы". Падумаў сабе: а што, вось, да гэтай пары рабілі іншыя арганізацыі і ўстановы, якія дзейнічаюць у гэтай галіне, фонды ці хоць бы павятовыя і ваяводскія ўстановы працы? Нашто яны існуюць, калі трэба ажыццяўляць кожную праграму, у гэты раз імпартаваную са ЗША. Зразумеў я гэта пасля заканчэння прамоў, калі самаўраднікі, чыноўнікі і іншыя запрошаныя ў палац (прызнаюся: і я таксама) накіраваліся да агромністага шведскага стала, застаўленага смакавітымі вяндлінамі, салатамі, бутэрбродзікамі з ікрой ды ласосем. Урэшце ж, каб змагацца — трэба мець сілу! Гэта, вось, значыць, што самаўраднікі і чыноўнікі будуць мець сілу справіцца з беспрацоўем і „будаваць трывалае партнёрства".

Думаў я аб урачыстасці ў палацы Браніцкіх пару дзён, і сніліся мне тыя вяндліны, ікра ды ласосі. Забыўся аб гэтым толькі пасля таго, як паглядзеў бягунняў на сто метраў на алімпіядзе ў Афінах. Перамагла беларуска Юлія Несцярэнка. Была на тры сотыя секунды лепшая (10,93) ад чарнаскурай Лёрын Вільямс. Польскія каментатары захапляліся:

— Гэта першая белая бягуння, якая пасля больш за 20 гадоў на гэтай дыстанцыі перамагла чарнаскурых спрынтэрак.

Так, вось, аказалася, што беларусы могуць абараніць гонар белай расы. Быццам бы ў алімпійскіх змаганнях справа была ў расавай канкурэнцыі. Да гэтай пары, па-за спартыўнай, гаворка была аб гонары нацый, дзяржаў. У выпадку беларускіх спартсменаў пераклаўся ён м.інш. на 60 тыс. долараў узнагароды ад прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. У іншых краінах — на нават і больш. Бо ж не толькі падляшскія самаўрадаўцы ды чыноўнікі мусяць есці. Спартсмены таксама. А беспрацоўныя?

Мацей Халадоўскі

Людзі з Польшчы выкупілі ў Мельніку пустуючыя драўляныя дамы, якія прыстасавалі на летнія дачы. Трэба тут заплаціць ад 4 да 10 тысяч злотых за квадратны метр участка, на якім можна пабудавацца...

Прывабны Мельнік

У Мельнік хацеў я дабірацца праз Сямятычы і Адамова, бо праз гэтыя мясцовасці праходзяць ваяводскія дарогі. Пасля рашыўся скаратаць дарогу і паехаць праз Грабарку. Не пашкадаваў, бо побач дарогі ўбачыў шырокі, прыгожы Буг. Не найлепшую якасць дарогі кампенсавалі прыгожыя краявіды па другі бок ракі. Мой суразмоўца, працаўнік Гміннага асяродка культуры Віктар Дацэвіч, звярнуў увагу, што едзем яшчэ з беларускага боку ракі. З другога боку жылі праваслаўныя ўкраінцы, якіх у час акцыі „Вісла" павывозілі ў розныя куткі Польшчы.

У Мельніку краявід памяняўся з нізіннага на ўзгорысты. З узгоркаў відаць частку мясцовасці. Драўляныя дамы раскінуліся непадалёк ад ракі, якая прыгожа паварочвае ўбок. Сярод кустоў заўважылі мы рэшткі старых умацаванняў. Калі сышлі ніжэй, убачылі руіны мельніцкага замка. Мой суразмоўца паінфармаваў, што ў Іпацьеўскім летапісе ўпамінаецца пра нашэсце татараў на Мельніцкае гарадзішча ў 1241 годзе. Аб тым, што першымі жыхарамі Мельніка былі праваслаўныя вернікі гаворыць цытата з 1263 года: „У Мельнік, у царкву святой Багародзіцы прыбыў князь Галіцкі Васілька, каб пакланіцца іконе Спаса Збавіцеля".

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Руіны мельніцкага замка

— Легенда гаворыць, што спачатку залатая Узнясенская царква пабудавана была на гары, якую зараз называюць Ушэсце (так на Беласточчыне называюць свята Узнясення Гасподняга — А. М.). Калі людзі сталі наракаць на Бога ў час свята Уваскрэсення Гасподняга, яна правалілася скрозь зямлю. Калі на Вялікдзень нехта прыкладзе вуха да зямлі на вяршыне ўзгорка Ушэсце, то можа пачуць як звоняць, — расказвае Віктар Дацэвіч. — Гара Ушэсце асаблівая па геаграфічных прыкметах. Выпадае на яе вельмі мала дажджоў. Цеплыня грунту ў некаторых месцах даходзіць нават да 70 градусаў і расце там раслінасць характэрная для наваколля Чорнага мора. З'яўляецца яна самым высокім месцам у Мельніку.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

З Замкавай гары відаць частку Мельніка і прыгожую раку

На ніжэйшай Замкавай гары збудаваны быў у X стагоддзі горад. У XIII стагоддзі на гэтай гары ўзнік замак, а непадалёк збудавалі мост на рацэ Буг. Мельнік стаў гандлёвым цэнтрам і пачаў бурна развівацца. Гарадскія правы атрымаў ён у 1440 годзе, а магдэбургскае права ў 1501 годзе. У 1655 годзе знішчаны быў замак і горад Мельнік.

— Войскі шведскія, трансільванскія і маскоўскія настолькі знішчылі Мельнік у XVII стагоддзі, што з 1,5 тысячы яго жыхароў засталося ў жывых толькі асоб 500, — кажа Віктар Дацэвіч. — Уладальнік Сямятыч граф Тэнчынскі атрымаў дазвол на будову моста каля сваёй мясцовасці і з гэтай пары Мельнік страціў сваё гандлёвае значэнне. Пасля трэцяга падзелу Польшчы Мельнік апынуўся на мяжы дзяржаў. Калі раніцай певень спяваў у Мельніку, чулі яго ў Расіі, Прусіі і Аўстрыі.

Калі Буг памяняў сваё цячэнне, мельніцкія лугі апынуліся за межамі горада. Пасля былі клопаты з іх выкарыстаннем, бо Мельнік знаходзіўся ў Расіі, а лугі былі ў Прусіі. Калі ў 1939 годзе Мельнік апынуўся ў Савецкім Саюзе, лугі засталіся на акупаванай немцамі тэрыторыі. Зараз Мельнік знаходзіцца ў Падляшскім ваяводстве, а яго лугі ў Мазавецкім. Гарадскія правы Мельнік страціў у 1934 годзе па просьбе жыхароў, якія хацелі паніжэння падаткаў.

— Калі перад вайной у Мельніку жыло каля 1,5 тысячы людзей, то трэцюю частку састаўлялі жыды. Пасля немцы іх вывезлі. Некалькі яўрэяў ізноў купілі ў Мельніку дамы, — кажа жыхарка Мельніка, якая хоча застацца ананімнай. — Пасля вайны быў у нас невясёлы час. Прыходзілі банды, палохалі праваслаўных людзей і прымушалі выязджаць у Савецкі Саюз. Гаварылі „Вашая Польшча за мяжой". Некаторых забілі, іншыя выехалі.

— Гаворым, што мы беларусы, а размаўляем па-нашаму. Малодшыя размаўляюць на польскай мове, — заяўляе Яўген Дацэвіч, якога сустракаю каля рэчкі. Паводле яго, у Мельніку да вайны жыло ў два разы больш праваслаўных за каталікоў. Зараз колькасць праваслаўных і каталікоў амаль зраўнялася.

Прыгожы мураваны будынак гміннай управы знаходзіцца непадалёк ракі. Войт Яўген Віхоўскі, якога сустрэлі мы побач Буга, кіруе гмінай 14 гадоў.

— Калі я стаў войтам, грошай у гмінным бюджэце ледзь хапала на бягучыя справы. Пасля апошняй рэформы фінансаў больш падаткаў ад прадпрыемстваў застаецца ў гміне. У гэтым годзе каля 40% бюджэту прадбачваем выдаткаваць на інвестыцыі, — кажа войт Яўген Віхоўскі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Войт Яўген Віхоўскі

Ужо ў гміне закончана будова водаправодаў і тэлефоннай сеткі. У гэтым годзе ў многіх вёсках выконваюцца тратуары і некаторыя дарогі будуць асфальтавацца. Хутка распачнецца будова ачышчальні сцёкаў і каналізацыі. Інвестыцыя будзе рэалізавацца ў 7 этапах і будзе каштаваць каля 4,5 мільёна злотых.

— На школы атрымліваем каля 1 мільёна асветнай субвенцыі, а выдаткоўваем на асвету каля 3,5 мільёна злотых. Аднак варта інвеставаць у адукацыю дзяцей, — гаворыць войт. — Сярод вучняў Комплексу школ у Мельніку (адзіная школа ў гміне, дзе вучыцца каля 300 дзяцей — А. М.) было многа пераможцаў у розных конкурсах. Выпускнікі гімназіі напісалі завяршальныя экзамены з самымі лепшымі вынікамі ў Сямятыцкім павеце.

Войт Яўген Віхоўскі не ведае, ці ў мінулым адбывалася навучанне беларускай мовы ў школах гміны.

— Калі б былі ахвотныя вучыцца беларускай або ўкраінскай мовам, знойдуцца сродкі на рэалізацыю такой задумы, — адказвае войт на мае пытанні наконт беларускай мовы.

У Мельніцкай гміне, якая займае тэрыторыю 19 600 гектараў, жыве каля 3 тысяч людзей, з чаго ў самім Мельніку каля тысячы. Самым вялікім прадпрыемствам з'яўляецца Нафтаперапамповачная станцыя ў Адамове, якая з'яўляецца філіялам Прадпрыемства эксплуатацыі нафтаправодаў у Плоцку. У адамоўскім філіяле працуе пад 100 асоб, а каля 200 людзей з плоцкага прадпрыемства займаецца рамонтнымі работамі і разбудовай абсталявання на тэрыторыі Мельніцкай гміны. Другім па велічыні плацельшчыкам падатку ў гміне ёсць Мельніцкае крэйдавае прадпрыемства. Лёгка яго знайсці, бо ў наваколлі ад крэйды пабелена раслінасць. Калі мы пад'язджалі да месца, у якім дастаюць сыравіну для вытворчасці крэйды, усё там было белым. Дарога даходзіць там да крутога абрыву, а далёка ўнізе відаць невялічкія машыны, якія ў кар'еры здабываюць сыравіну. Каля берага стаіць абсталяванне для перагрузкі крэйды. Прадпрыемства моцна забруджвае паветра ды стварае цяжкасці для тых жыхароў Мельніка, якія жывуць у яго наваколлі. Каля 20 асоб працуе ў Гмінным кааператыве і яго крамах. Іншыя знайшлі работу ў сталяроў і паслуговых пунктах.

— Ёсць і ў нас беспрацоўе. Людзі выязджаюць за працай у Нямеччыну, Бельгію і Францыю. У нашай вёсцы зямля дрэнная, пятага і шостага класаў. Людзі найчасцей сеюць жыта, авёс і ўтрымліваюцца з вытворчасці малака. Ёсць і так, што пенсіянеры ўтрымліваюць малодшых сямейнікаў, якія застаюцца без працы, — кажа солтыс Гаматоў Мечыслаў Ярашук, якога сустракаю ў Мельніку.

У Такарах, дзе добрыя землі трэцяга і чацвёртага класаў, ёсць некалькі гаспадароў, што займаюцца гадоўляй кароў і свіней. Сярод іх войт Яўген Віхоўскі, у якога 3 каровы, 25 свіней і добрыя пшанічныя землі. Некалькі яго сяброў з Такароў гадуе па 10-15 кароў. Аднак самыя вялікія жывёлаводы ў Машчоне-Каралеўскай, бо ў іх пад 30 штук быдла. Агратурыстычнай дзейнасцю заняліся мельнічане, якія жывуць бліжэй Буга і прыбужанскія жыхары Мельніцкай гміны. Зараз у гміне пад 200 начлежных месц у агратурыстычных кватэрах. Людзі з цэнтральнай і паўднёвай Польшчы выкупілі пустуючыя драўляныя дамы, якія прыстасавалі на летнія дачы. Зараз у гміне цяжка знайсці старую хату, якую можна было б яшчэ купіць. У Мельніку трэба заплаціць нават ад 4 да 10 тысяч злотых за квадратны метр участка, на якім можна пабудавацца. Пасля будовы каналізацыі Мельнік можа стаць мясцовасцю яшчэ больш прывабнай для мігрантаў з Польшчы. Разам з патокам турыстаў і польскіх мігрантаў працэсы паланізацыі могуць паскорыцца. У час апошняга перапісу насельніцтва 4,7% жыхароў Мельніцкай гміны назвала сябе беларусамі і 0,68% — украінцамі.

Аляксей Мароз

Чароўная Нараўка

Шаснаццаць мастакоў-жывапісцаў з Варшавы і Беластока ўвекавечвала на палотнах чароўныя закуткі на тэрыторыі Нараўчанскай гміны, між іншым, наваколле Новага і Старога Ляўкова ды Масева, а таксама над ракою Нараўкай і на ўзлессі Белавежскай пушчы. Пасляпленэрную выставу можна глядзець у будынку старой школы ў Нараўцы, па вул. А. Міцкевіча.

Складаецца яна з 27 алейных карцін і пастэльных малюнкаў. Ваколіцы Ляўкова зачаравалі жывапісцаў з Варшавы: Тэрэсу Радомскую-Кусаль, Гражыну Астроўскую, Веславу Віснеўскую, Рышарда Матэрна, Івону Сельчак і Яцка Букоўскага, Здзіслаў Мяноўскі захапіўся Масевам. Карціны з пленэру астануцца ў Нараўцы, дзе ствараецца галерэя.

Варта дадаць, што праз год такога роду мастацкі пленэр запланавалі ў Масеве. Сёлета мастакі раскватараваліся ў гасцініцы ў Старым Ляўкове. Камісарам пленэру быў мастак Віктар Кабац з Гайнаўкі. **(мох)**

Нарваўскія дарогі

Праязджаючы павятовымі дарогамі ў Нарваўскай гміне, прыпомніўся мне верш Віктара Шведа п.з. „Дарогі" напісаны шмат гадоў таму:

Дарогі, дарогі і тыя
Змяняюць свой від у вачах.
А ўздоўж іх слупы вартавыя
Трымаюць драты на плячах.

Сапраўды, слупы трымаюць драты. Пагінулі тэлефонныя стаўбы, а лінію правялі пад зямлёй. Даўно ўжо зніклі стаўбы ад папулярнай калісьці „точкі". Асталіся толькі электрычныя стаўбы і яны, думаю, будуць стаяць пакуль будуць жыць тут людзі.

Непакоіць мяне стан абочын паабапал дарог. Летняй парою на абочынах і ў равах расце пустазелле ды буяюць карчы лазняку амаль у рост чалавека. У некаторых месцах, асабліва на паваротах, не відаць над'язджаючых аўтамашын, а гэта пагражае дарожнай аварыяй.

Падумайце, павятовыя ўлады ў Гайнаўцы, і пачысціце абочыны ды равы так, каб усе павароты былі віднымі ды бяспечнымі. **(мл)**

Памяць

Штогод у гадавіну вызвалення Беласточчыны з-пад нямецкай акупацыі жыхары вёскі Рыбакі наводзяць парадак на магілах загінуўшых савецкіх салдат. Ва ўрочышчы „Гарабінка" недалёк сябе знаходзяцца дзве магілы, у якіх вечным сном спяць невядомыя салдаты. Вакол іх высіцца стройны сасновы лес. На адной магіле ўстаноўлены бетонны крыж, на другой — жалезны, а абедзве яны абведзены плоцікам. Адну магілу абсадзіў бярозкамі Юлік Б. Сёння яны тоўстыя і высокія, гавораць з небам і пасылаюць у эфір сны салдат іх родным, паведамляюць, што мясцовым насельніцтвам байцы не забытыя.

Віктар Бура

Нават гною няма

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Від на Талькоўшчыну

У дзевяць гадзін сонечнай раніцы ў Талькоўшчыне царыць цішыня, нягледзячы на тое, што адзін канец вёскі перасякае шаша з Беластока ў Крынкі. Іду брукаванай вуліцай і не заўважаю ніводнай дарослай душы, ажно пад канец вёскі бачу кабету, прысеўшую на парозе прыадкрытай клуні. Загуменнем заходжу да яе. Распусціла яна на панадворку сена, чакае аж крыху падсохне, каб павярнуць. Надвор'е сёлета зменлівае, быццам жаночы характар, таму за сенам трэба пільна сачыць. Пытаю пра адсутнасць вяскоўцаў і даведваюся, што яны таксама падаліся сена даглядаць. Таварных гаспадарак у вёсцы няма, няма маладых гаспадароў, а пажылыя трымаюць адно сабе то кароўку, то свінку, то курэй пару.

Маёй субяседніцы за семдзесят, але трымаецца яна выдатна. Калі пытаю, ці не прастудзіцца басанож на цэментнай падлозе, здзіўляецца, што такое можа быць. Дарэчы, тое яе здароўе мо і вынікае не столькі з моцнага складу цела, але і некаторай адсутнасці лішніх хваляванняў. Ейныя дзеці жывуць у Беластоку, але ў якім квартале, гэтым яна сабе галавы не марочыць, не ведае. Яе ўнучкі недзе спяваюць, некуды ездзяць...

Спачатку мяне крыху здзівіла, што яна басанож, але ўжо пасля прыгадаў, што калі я стаў хадзіць у школу, здзіўляла не толькі мяне, але і іншых вясковых хлапчукоў, што наш настаўнік ходзіць у абутку, а не так як мы — басаногія. Час змяніўся, народ распанеў і цяпер нават на вёсцы можна выклікаць смех, выйшаўшы з босымі нагамі. Дарэчы, нават у тэлевізары лічым вартым даверу і пашаны таго, хто пакажацца ў сіняй кашулі і пад гальштукам, нават у бела-чырвоныя палоскі.

Пра вялікую палітыку, я, вядома, са сваёй субяседніцай не размаўляў. Пагутарыўшы яшчэ слоў некалькі, падаўся я далей, а жанчына паднялася памагаць прыйшоўшаму мужу варочаць сена, распушчанае на ўчастку за плотам. За іншым плотам іхняга панадворка бегала пара падсвінкаў. І здалося мне, што гаспадараць яны толькі з прывычкі, па ментальнай інерцыі. Адна старана ў клуні была да паловы занята свежым сенам, палову другой займала старая пацюкаваная салома.

Талькоўшчына выглядае так, як і іншыя неадлеглыя ад Беластока вёскі. Частка хат зусім пустуе, частка аддзелана звонку сайдынгам гарадскімі выхадцамі. Не заўважыў я ніводнага панадворка, уезд у які быў бы раз'езджаны сельскагаспадарчымі машынамі. Вёска дрэмле ў цяньку Беластока.

Ідучы ў суседняе Трысцяное звочыў я ледзь бачную жанчыну, што корпалася ў падыходзячым пад сенажаць агародчыку. Кабета згорбленая не толькі гадамі, палола свае бледна-зялёныя раслінкі, якія вельмі кантраставалі з суседнімі сакавіта-зялёнымі кустамі бульбы.

— Мусіць не ўгнойваеце свайго агарода? — спытаў я.

— Не, не даю навозаў. Але ў мінулым годзе, — тлумачыла, — гэтаксама спачатку былі слабыя ўсходы, але пасля гародніна вырасла як трэба.

— А можа б гною трэба было даць, мо хто з вяскоўцаў прывёз бы вам?

— У нікога гною няма.

Мо гэта не зусім праўда, мо нікому не хочацца падкінуць адзінокай бабульцы тых чатырох капічак на кволы агародчык, але гэты просты адказ — мо яшчэ футурыстычны толькі — можа служыць цалкам змястоўным апісаннем гаспадарання ў некаторых вёсках нашай Усходняй сцяны; нават гною няма.

Аляксандр Вярбіцкі

Пачыналі з нуля

Абое яны прыбылі ў Беласток з беларускіх вёсак Гайнаўскага павета. Вера — з Барысаўкі, а Валодзя — з Лапухоўкі. Яна ў той час працавала на тэкстыльным камбінаце „Фасты", ён — у міліцыі. Маладажоны пачаткова здымалі кватэру ў Дайлідах-Гурных. І хаця далекавата было даязджаць на працу на аўтобусе, аднак гэта ім не мяшала, таму што зарплаты ў іх былі прыстойныя. Тады паявілася задума пабудаваць дом. Уладзімір Ваўранюк меў дыплом сталяра і крыху працаваў не толькі ў гэтай прафесіі, але і муляром у вольныя дні і гадзіны. Такім чынам прычыняўся да павелічэння сямейнага бюджэту. З часам Ваўранюкі набылі пляц у Дайлідах-Гурных і пабудавалі дом. З будовай складанасцей не было, таму што Валодзя — майстар на ўсе рукі і характэрная яму сялянская працавітасць ад усходу да захаду сонца. Але драўляны дом не быў па Валодзевай думцы, таму Ваўранюкі праз нейкі час яго прадалі. Маючы гэтым разам дастаткова грошай, купілі па Беластоцкай вуліцы ў Дайлідах-Гурных вялікі пляц і пабудавалі двухпавярховы мураваны дом. Было гэта ў 1979-1980 гадах. Валодзя не наймаў майстроў, усё рабіў сам пры частковай дапамозе жонкі Веры. Добра Валодзя распланаваў пакоі на першым і другім паверхах, а таксама памяшканні ў падвальнай частцы будынка, дзе між іншым знаходзіцца гараж.

Фота РАІСЫ АЎСЯЙЧУК

Амаль адначасова з домам Валодзя пабудаваў гаспадарчае памяшканне. Разам з Вераю добраўпарадкавалі вялікі пляц, на якім разбілі загоны, на якіх вырошчваюць экалагічную, без мінеральных угнаенняў агародніну. Пазней яны так добраўпарадкавалі прысядзібны ўчастак, што ў ім многа кветак і дрэў, у тым ліку фруктовых, а сярод іх — сажалка. Пабыць у іх агародзе, пасядзець за сталом пад парасонам, выпіць гарбату ці чарку віна і паслухаць музыку — вялікая прыемнасць. А Ваўранюкі — людзі гасцінныя. І я ў іх быў, і віно піў з нагоды ўзнагароджання Веры ордэнам Марыі Магдаліны, які нядаўна ў царкве ўручыў ёй епіскап Іакаў. Тады члены Праваслаўнага брацтва св. Мікалая разам са сваім духоўным апекуном а. Георгіем віншавалі яе і весяліліся. Вера — дзяячка брацтва і праваднік арганізаваных брацтвам пілігрымак. Яна — шанаваны чалавек у сваёй вёсцы, якая скора будзе далучана да горада Беластока. Пакуль што Дайліды-Гурныя належаць да Заблудаўскай гміны. Грамадскасць гэтай вёскі выбрала Веру Ваўранюк солтысам. Ідучы ад аўтобуснага прыпынку па вуліцы Беластоцкай пры двухпавярховым прыгожым доме віднее таблічка з надпісам „Солтыс". Солтыс-жанчына — з'ява наогул рэдкая. З абавязкамі начальніка вёскі Вера Ваўранюк спраўляецца паспяхова. Трэба падкрэсліць і той факт, што Вера добрая, клапатлівая маці. Ваўранюкі выхавалі тры дачкі. Яны ўжо паўналетнія, маюць свае сем'і. Адна з іх жыве ў Англіі. Калі прыязджае, займае з мужам увесь другі паверх.

— Тут кватаруюцца мае англічане, — з гонарам гаворыць Валодзя. — А вось тут царкоўка Веры. Спецыяльны вугалок, у якім ёсць і лампады, і крыж, і іконы, а на століку — малітоўныя кніжкі.

Валодзя паказаў таксама дагледжаны гараж, у якім стаіць шыкарная легкавая машына.

Дом і прысядзібны агарод можна ставіць іншым у прыклад. Ваўранюкі здабылі ўсё гэта ўласнай працай. А пачыналі яны з нуля.

Міхась Хмялеўскі

Пад крыламі св. Мікалая

У пілігрымку, вандроўкай на падсадку, мы выправіліся не з-за шпаны, а з-за звычайнага безграшоўя. І нават калі нас палохалі мафіяй, у душы не было страху. Як наказвае этыкет паломніка мы, зразумела, трымаліся посту. Калі кантрабандыст Васыль стаў частаваць салам, мы ветліва яго папракнулі.

— Ай, які з мяне дурань! — жахнуўся дзядзька. Хоць Васыль быў старэйшы за нас на дваццаць гадоў, з маршу палічыў нас аўтарытэтамі ў рэлігійнай справе. Бо як жа інакш — каб з такой далечыні ў іх Пачаеў брысці?

* * *

У манастыр мы дабраліся на другі дзень падарожжа, на зыходзе дня. На месцы заначавалі ў прыватнай кватэры (два долары за начлег). Яшчэ ў той самы дзень мы памыліся, надзелі спадніцы і хустачкі ды пайшлі ў Лаўру. Трэба было спяшацца: ужо ў дзесяць вечарам зачыняюць уваходную браму і ўсе цэрквы.

Пачаеўская лаўра хутчэй нагадвае сілезскі ці аўстрыйскі кляштар. Невыпадкова. Пабудаваная яна ў 1771-1783 гадах паводле праекта Іагана Готфрыда Гофмана, якога прызваў з Сілезіі апякун і спонсар манастыра Мікола Патоцкі. Найбольш ашарашвае архітэктура царквы: пабудавана яна ў стылі ракако!

Успенская царква ўжо была закрыта і мы накіраваліся ў сабор Святой Тройцы. У храме, завершаным залатым купалам, адпраўлялася вячэрняя багаслужба. З сярэдзіны даляталі анёльскія напевы царкоўнага хору.

Перад уваходам першы ўрок пакорлівасці: тут кідаліся ў канвульсіях апантаныя, з якіх самі па сабе выганяліся чэрці. Іх дзікі крык і віск нікога тут не здзіўляў. Няшчаснымі апекаваліся кабеты або манахі. Павязалі апантаным ногі і, узяўшы пад рукі, прахаджваліся з імі па царкоўным пляцы.

Здавалася — мы завандравалі ў часы Ісуса Хрыста.

* * *

На другі дзень мы прачнуліся на світанні і падаліся да цудадзейнай іконы Божай Маці, якая знаходзіцца ва Успенскай царкве. Залатыя купалы ледзь прасвечвалі з-за густой імглы. Манастыр стаіць на высокай, непрыступнай гары. Яго гісторыя сягае XIII стагоддзя, калі скітаючым пустэльнікам явілася Божая Маці. Народны культ падмацавала Ганна Гойская, жонка луцкага суддзі, якая ў 1559 годзе пабудавала царкву і падарыла ёй цудоўную ікону, прывезеную з Канстанцінопаля.

Ля каплічкі св. Мікалая ў Старым Самбары. Разам з намі Валодзя, сын свяшчэнніка

У 1713 г. Лаўра апынулася ў руках уніятаў-базільянаў. Час новых пабудоў звязаны з уступленнем у ордэн Канеўскага старасты Міколы Патоцкага. У 1779 папа Клімент XIV падарыў іконе карону, а сам манастыр пачалі зваць „Чанстаховай грэка-каталікоў". Пасля лістападаўскага паўстання 1830 г. манастыр вяртаецца ў праваслаўе. У царскай Расіі, па рэлігійным значэнні, Пачаеў ставяць на чацвёртым месцы, шчодрыя цары не шкадуюць золата. Кляштар непарушаны ў час войнаў мінулага стагоддзя. У савецкі час тут размяшчаюць шпіталь. Зараз, пад Маскоўскім патрыярхатам, па значэнні лічыцца ён другім за Кіеўска-Пячэрскай Лаўрай, рэлігійным цэнтрам Украіны.

* * *

Хоць браму манастыра адкрываюць у шэсць гадзін, ужо з самага ранку тут маліліся сотні паломнікаў і манахаў. Найбольш народу прыязджае тут 28 жніўня (на Спленне) і 10 верасня (на Іава).

З пачатку мы сталі ў чарзе да каменя з адбіткам ступні Божай Маці, з якога б'е крыніца. Парадку ў чарзе пільнаваў міліцыянт, і паломнікі паводзілі сябе стрымана і прыстойна. Аднак, у чарзе па святую ваду з іншай святой крыначкі (там не было міліцыянта), нас ледзь не растапталі нецярплівыя цёткі. Большасць паломнікаў — вяскоўцы.

Больш за гадзіну трэба было стаяць у чарзе да храма святога Іава, які знаходзіцца ў падземнай капліцы Успенскай царквы. Менавіта тут (без экзарцызмаў), аздараўляюцца апантаныя. Крыкі і лямант — звычайная тут карціна. Пасля сустрэнем іх зноў на царкоўным пляцы. Тут жа маладыя дзяўчаты, немаўляты на руках заплаканых матуль, сівыя старэчы.

У Лаўры забараняецца рабіць здымкі, немагчыма таксама перадаць словамі атмасферу і намоленасць месца. Не апішаш радасці, якая нараджаецца тут ад малітвы і перажытага. У час ад'езду ў грудзях яшчэ доўга паліць боль ад расстання з цудадзейным месцам.

* * *

У паваротнай дарозе нам спрыяе і дапамагае св. Мікола. Наведваем яшчэ Івана-Франкоўск і Драгобыч. Падмацоўвае нас адраджэнне ўкраінскай мовы, ветлівасць і бескарысная дапамога. Апошнюю ноч праводзім у Старым Самбары. Начуем у парафіі св. Мікалая, дзе ў адной царкве служаць праваслаўныя і грэка-каталікі.

Раніцай, зноў на падсадку, вяртаемся ў Беласток. Мы ў захопленасці ад украінцаў, што абаранілі сваю моц і незалежнасць!

Ганна Кандрацюк

Дыскрымінуюць Усходнюю сцяну

Слухаючы тэлебачанне і радыё часта чуем як дыскрымінуюць Усходнюю сцяну. Тут трэба прыгадаць пратэст Падляшскага ваяводы і маршалка ваяводства супраць несправядлівага падзелу грошай на ахову здароўя. У параўнанні з іншымі ваяводствамі ў краіне, Падляшскае атрымала найменш грошай. Што тычыцца прыдзелу самаходаў хуткай дапамогі, дык на Падляшскае ваяводства прыдзялілі адзін амбуланс, а некаторым ваяводствам па... пятнаццаць. Не памаглі нават пратэсты працаўнікоў аховы здароўя, якія з усяго ваяводства паехалі ў Варшаву пратэставаць, і заявілі, што будуць там так голасна крычаць, каб пачуў іх увесь свет.

Нашы чыноўнікі ў вярхах не клапоцяцца аб тым, каб найбяднейшы куток краіны, якім з'яўляецца Падляшскае ваяводства, дараўняць да сярэдняга ўзроўню ў дзяржаве, толькі стараюцца аблясіць Усходнюю сцяну, каб стварыць тут умовы для адпачынку ім, ды прыязджаць сюды на паляванні. Пры нямецкай акупацыі, уладар Падляшша Э. Кох, планаваў спалучыць Белавежскую пушчу з Кнышынскай, мясцовае насельніцтва выселіць, а тут паляваць на лясную звярыну. Сярод цяперашніх нашых уладароў многа такіх, што памянялі свае прозвішчы, імёны і сталі веруючымі каталікамі ды цалуючы біскупаў па руках, валодаюць краінай. Тут, на Усходняй сцяне, ад вякоў пражываюць нацыянальныя меншасці: беларусы, украінцы, літоўцы, татары, расіяне. Яны ўсе дбаюць аб нашу дзяржаву і хочуць каб усім лепш жылося. А што гэта грамадзяне іншых веравызнанняў, дык пра іх чыноўнікі на „вярхушцы" не дбаюць.

Падумайце, уладары, ці вам патрэбны толькі нашы галасы падчас выбарчых кампаній? Задбайце пра Усходнюю сцяну і яе насельніцтва.

Мікалай Лук'янюк

Старыя раны

Слаўны „патрыёт" „Буры" са сваім атрадам зімою 1946 года праходзіў і праз Дубічы-Царкоўныя; ішлі бадай з Вітава, дзе забілі некалькіх чалавек. Шчасце, што ў нас яны не затрымаліся, хаця наткнуліся на двух вартаўнікоў, якія трымалі сваю варту. Успелі яны шмыгануць у адну хату, але людзі са зброяй паследавалі за імі:

— Хто вы такія?

— Мы вартаўнікі вёскі.

Пачуўшы такі адказ яны гаспадара хаты не чапалі, але ягонага суседа Міхала Марчука пагналі з сабою ў Залешаны. Загналі ў хату, якую падпалілі. З тае хаты сталі ўцякаць безабаронныя людзі; большасць іх загінула на месцы.

Сярод бандытаў былі, аднак, парадачныя людзі, што стралялі ў паветра і падказвалі ўцякаць. Былі аднак і такія, што стралялі па людзях. Міхал уцалеў.

За нашага аднавяскоўца Мікалая Тамашука праз нейкі час выйшла замуж малодшая за яго на 22 гады маладая ўдава Ганна, каторай муж і двое дзетак згарэлі ў той хаце. Мікалай з Ганнай нажылі яшчэ трое дзетак. Ганна жыве па сённяшні дзень, але кажа што ўжо нішто яе не цешыць і не радуе.

Мяркую, што старыя раны раскрыліся і няма ад гэтага ніякага лякарства.

Мікалай Панфілюк

„Ніва" ў Чаромсе

У сямідзесятыя гады „Ніва" ў кіёску на пероне ў 50 экземплярах расходзілася, а пошта мела чатырнаццаць пастаянных падпісчыкаў, а ў пачатках гэтага года адно адзін экземпляр прысылалі ў згаданы кіёск на чыгуначнай станцыі. Навагодні нумар з календаром купілі больш за дзвесце асоб.

Пацікавіўся я „Нівай" у палове жніўня. Прадаўшчыца Галіна Шатыловіч заявіла з усмешкай:

— Зараз дзесяць экземпляраў прысылаюць. Усе разыходзяцца. Бо пра Елянку многа пішуць...

Што паўплывала на зацікаўленне тыднёвікам у Чаромсе, дык цяжка сказаць. Факт застаецца фактам. Трэба цешыцца і хадайнічаць за тым, каб колькасць чытачоў „Нівы" ў Чаромхаўскай гміне намнога больш павялічылася.

(ус)

Больш асфальту

З Сушчы ў Лешукі (Нараўчанская гміна) вяла ўхабістая гравейка. Яе раўнялі, але грузавыя аўтамашыны зноў рабілі тут г.зв. валкаўніцу. У ліпені г.г. на гэтым адрэзку шашы паклалі асфальт. Пра гэта паклапацілася Нараўчанская гмінная ўлада.

Сюдою кожны дзень ездзяць аўтобусы ПКС з Беластока ў Гайнаўку праз Жэдню, Міхалова і Сушчу. Варта дадаць, што на адрэзку гэтай важнай шашы з Новай Волі ў Сушчу асфальт паклалі пару гадоў таму. Цяпер маем такую маставую з Сушчы ў Лешукі і гэтым самым зараз будзем мець выгаду. Будзем ездзіць па роўнай асфальтаванай дарозе.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пачатак навучальнага года ў ПШ н-р 4 у Беластоку

Распачаўся школьны год

Распачаўся школьны год,
Цёплае мінае лета,
Безліч веселых прыгод
Сонейкам сагрэтых дзетак.

І ад рэк, палёў, лясоў,
Па спякотным адпачынку
Дзеці хлынулі ізноў
Да асвежаных будынкаў.

Маюць новы школьны клас
Маладыя непаседы.
Ім настаўнікі ў запас
Пераказваць будуць веды.

Працы ў школе заўжды шмат,
Усіх навук абсяг вялікі
Прысвойваць трэба акурат
Штодзённа да другіх канікул.

Віктар Швед

Казкі бабулі Юстыны

Жыве бабуля Юстына на хутары, на самым ускрайку лесу. А гадоў ёй, напэўна, столькі ж, колькі старой сасне ў гэтым лесе. Бо памятае бабуля Юстына такія даўнія часіны, калі кветкі былі людзьмі, а людзі ўмелі размаўляць з дрэвамі і птушкамі.

Ці было ад гэтага шчаслівей людзям, дрэвам і птушкам — невядома. І ў той час людзі крыўдзілі адзін аднаго, і, вядома, даставалася ад іх кветкам і звярам, рэкам і лясам... Нездарма каб знайсці патрэбную зёлку, бабулі Юстыне даводзіцца цяпер шукаць запаветныя мясціны. Бабуля — зельніца, і ведае, ад якой хваробы дапамагае якая трава.

Але сёння ёсць травы і кветкі, якіх нельга зрываць — бо знікнуць, і збяднее Божы свет яшчэ на адну прыгажосць.

Ты скажаш, дружа, што не ўсе кветкі і травы прыгожыя?

А вось і памыляешся: як у душы кожнага чалавека схаваная дабрыня, так у кожнай жывой істоце схаваная прыгажосць і дзівосная гісторыя. Трэба толькі ўмець убачыць, умець пачуць.

А калі не ўмееш — распытай зельніцу Юстыну. Яна пасадзіць цябе за накрыты вышываным абрусам стол, паставіць перад табой кубак з духмянай гарбатай, настоенай на верасе і чаборы, і раскажа...

Меч-трава

Кажаш, бег каля возера і парэзаўся аб такую брыдкую, калючую траву... Ну, па-першае, ты ўжо вялікі, і не варта плакаць ад драпіны. Зараз прыкладзем да парэзу лісцік трыпутніка, і ўсё зажыве. А трава, якая цябе парэзала, зусім нябрыдкая. Але праўда, што вострая, як лязо.

А калісьці на берагах нашых блакітных азёр раслі толькі мяккія, пяшчотныя травы і кветкі. І так прыемна было збягаць проста з лясной сцяжынкі ў прахалодныя, чыстыя, як шклянка, хвалі. Ты ж ведаеш, што нашы, беларускія, азёры самыя прыгажэйшыя ў свеце? Ці не таму на нашу зямлю ўвесь час прываблівіліся хціўцы-нападнікі?

На беразе гэтага возера стаяў замак. Паўз яго, паміж возерам і лесам, ішла дарога да багатых і прыгожых беларускіх гарадоў. Князь і яго воіны, што жылі ў замку, ахоўвалі дарогу ад ворагаў. З аднаго боку ў гэтым ім дапамагалі хвалі возера, з другога — сцяна пракаветнага лесу. І самі воіны былі дужыя, як карабельныя сосны, і нястрымныя, як хвалі. Самым моцным сярод іх быў княжацкі мечнік, дужы рыцар па імені Ярмол.

Насамрэч паходжання быў ён зусім не рыцарскага, а нарадзіўся ў той самай вёсачцы, у якой жывуць зараз вашы бабуля і дзядуля. Але рос Ярмол такім кемным і дужым, што патрапіў на службу ў княжацкае войска, адразу — як просты жаўнер, а потым сваёй адвагай заслужыў прыхільнасць князя і ў рэшце рэшт — рыцарскае званне.

Бо рыцарам можна нарадзіцца і ў курной хаце, і не меч, нават выкаваны найлепшымі майстрамі, дае воіну моц — а мужнае сэрца. Не раз біўся Ярмол паперадзе дружыны. Не раз ратаваў жыццё свайму князю.

Каханне таксама не ведае званняў. Ніхто не падазраваў, чаму мечнік Ярмол так часта просіцца ў начную варту. Думалі — хоча паказаць, як верна службу нясе. І толькі поўня, якая заглядала ў пакой адзінай княжацкай дачкі Галены, ведала таямніцу.

Ярмол і Галена сустракаліся так часта, як маглі, але досыць рэдка, каб прага новай сустрэчы палала ярчэй за самую зыркую паходню на сценах вартавых вежаў.

У каханні, вядома, вялікая сіла.

І вялікая слабасць — у ім жа.

Князь атрымаў звесткі, што зноў ворагі збіраюцца ісці праз наш лес на сталіцу вялікага княства. Пакуль што дарогі не пылілі, напад чакаўся праз некалькі дзён. І як заўсёды, Ярмол выклікаўся вартаваць ад поўначы да світання на вежы, якая стаяла над самым возерам і ў якой былі пакоі князёўны. А іншых вояў прызначыў на тыя вежы, з якіх праглядалася дарога.

На гэты раз ворагі не пайшлі ні па дарозе, ні праз лес. Яны апоўначы прыплылі на чоўнах да сцен замка і закінулі на вышчэрбленыя падчас шматлікіх аблогаў муры моцныя вяроўкі са сталёвымі крукамі.

А Ярмол, лепшы княжацкі рыцар, нічога не чуў. Ён глядзеў у бяздонныя вочы сваёй каханай, у якіх люстравалася поўня, і чулася яму адна пяшчотная музыка кахання. І толькі калі замест поўні ўбачыў ён у вачах каханай водбліскі пажару, зразумеў — адбылося непапраўнае.

Калі Ярмол уварваўся ў бойку, палова рыцараў была ўжо забітая, князь сканаў з варожай стралой у шыі, і надзеі на ратунак не заставалася. Мечнік біўся, як дзесятак вояў. Пачуццё віны памнажала яго сілы, але і пазбаўляла абачлівасці. Бо ў бойцы таксама патрэбная абачлівасць — калі, вядома, ты не хочаш памерці. Ярмол прапусціў моцны ўдар і ўпаў ля сцяны замка, на беразе возера, якраз

Чыс рыцараў

Марскія падарожжы

Калі дзьмуў спрыяльны вецер, карабель мог праплысці ў суткі аж трыста кіламетраў. Каб пераадолець такую адлегласць сухапутным шляхам, патрабаваўся тыдзень!

Падарожжа морам было небяспечным і капрызлівым. Калі на вадзе шалеў ураган, ён з лёгкасцю мог знічшыць любы карабель. А калі не хапала ветру — судны амаль не рухаліся з месца. Апрача сказанага на моры бушавалі піраты.

Калі дзьмуў некарысны вецер, маракі закідалі якар і чакалі на подых з іншага боку. Іх караблі былі масіўныя і глыбока засаджваліся. Яны маглі плаваць толькі па спакойных праверaных водах. Самымі універсальнымі марскімі машынамі ў сярэднявеччы лічылі судны варагаў. На іх можна было пераадолець рэчкі, моры і акіяны. Варагі, як адзначаюць старажытныя крыніцы, завіталі ажно ў Амерыку.

На караблі самай важнай асобай быў капітан. Ён апекаваўся таварам, вызначаў і адсочваў кірунак. Кірунак падарожжа вычытваў ён з зорак, а небяспечны подых навальніцы ўмеў разгадаць па выглядзе Месяца.

Калі задумаешся, ці ў той час марак баяўся мора, дык ведай: баяўся, страшэнна баяўся. Асабліва смерці на бясконцым моры і „пахавання" ў вадзе! Каб засцерагчыся ад злога, людзі мора здзяйснялі абрад ахвярапрынашэня ў цэрквах і касцёлах. Прыносілі мініяцюрныя мадэлі караблёў і суднаў. Наогул выконвалі іх з воску, багатыя мараплавы заказвалі ў рамеснікаў караблікі са срэбра.

(працяг будзе)

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У школьным музеі ў Кленіках

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

На ўроку беларускай мовы ў Рыбалах

Бывай

(песня „Н.Р.М."; рок-карона за найлепшы тэкст 1995 г.)

Нахіляецца долу невысокае неба,
Нахіляецца долу, пахне шэрай імжой.
Надыходзячы ранак пахне дымам і хлебам,
Надыходзячы ранак пахне ўладай чужой.

Прыпеў:
Бывай, мой родны край!
Бывай, мой родны горад!
Бывай, мой брыдкі брат!
Бывай, мой любы вораг!

Нас хісталі арэлі, ды агні дагарэлі.
Нас хісталі арэлі ад вады да зямлі.
Мы ў люстэркі глядзелі, ды ня ведалі, дзе мы, —
На якой паралелі, на якім караблі.

Прыпеў...

Мой апошні тралейбус па праспекце паедзе,
Загрукоча ўночы мой апошні трамвай.
Да наступнай сустрэчы пройдзе пару стагоддзяў,
Пройдзе пару стагоддзяў, а пакуль што — бывай.

Прыпеў...

з таго боку, які ён мусіў ноччу вартаваць — і не дапільнаваў.

Не, ён не загінуў. Але ці было яму ад гэтага радасці, калі, ачуняўшы, убачыў чорныя ад пажару муры замка, загінулых таварышаў... А калі ў роспачы азірнуўся, то заўважыў на хвалях возера, якраз пад вакном князёўны, нешта светлае — і быў гэта яе вэлюм...

Што ж, чыстыя хвалі возера — лепей, чым палон або ганьба...

І тады Ярмол разам са сваім баявым мячом зайшоў у хвалі, на якіх ужо люстравалася барва ўзыходзячага сонца, і ў адчаі ўзмаліўся:

„Няма апраўдання мне... Няма меры віны маёй... Дык няхай, Госпадзе, у выкупленне буду я вечна абараняць гэты бераг, воды гэтага возера ад ворагаў, і не буду адпачываць ані ўдзень, ані ўначы, ані ў спякоту, ані ў холад"...

Словы, сказаныя ад паўнаты адчаю, не знікаюць марна. І мечнік Ярмол ператварыўся ў высокую цёмную траву, якая рэжа, як сапраўднае лязо. Паспрабуй, прабяжыся скрозь такія зарасці — адчуеш меч вартаўніка. Нездарма назвалі гэтую расліну меч-трава.

Але ты не бойся ані траў, ані ворагаў. А калі здарыцца табе выбіраць паміж насалодай і цяжкім абавязкам, прыгадай мечніка Ярмола і меч-траву.

Людміла Рублеўская

Польска-беларуская крыжаванка № 36

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 32: Ружа, грошы, сера, сасна, раб, яблыня, ён, Ян, Об, лыжка. Сяло, граб, слых, жорны, анёл, рыс, яны, ер, жара, як, арабіна.

Санька з Сасновай вуліцы

... ну а лёс і Бог напэўна так хацелі, што ў Беластоку на вуліцы Сасновай мяне нарадзілі..., — піша ў сваім вершы Аляксандр Дрэслер. Сын беластоцкага муляра Густава і Ганны, пахаванай на праваслаўным могільніку ў Беластоку. Гадоў яму цяпер 84. У кнізе *Polak w świecie. Leksykon Polonii i Polaków za granicą*, якая прадстаўляе выбітных жывучых палякаў, прадстаўнікоў Палёніі, як і асобы захоўваючыя ўспаміны аб сваім паходжанні, што сваімі прафесійнымі дасягненнямі, палітычнай, мастацкай і грамадскай дзейнасцю прыслужыліся краіне з якой паходзяць, прозвішча Аляксандра Дрэслера апынулася сярод 850 заслужаных.

Здаўна ў Датчыне: *Сёння дацкія паперы носячы ў кішэні (...), здалёку жывучы ад таго, што мне дарагое, падпісваюся падлясякам!* Аўтар кнігі ў 600 старонак, „Тэхнічнага суднаплаўнага слоўніка" (8 839 загаловачных слоў) на пяці мовах — нямецкай, англійскай, дацкай, польскай і рускай). Шырока знаёміць ён з пабудовай і эксплуатацыяй суднаў, машын і іншага абсталявання і іх частак, а таксама прадстаўляе шмат паняццяў звязаных з марскімі ведамі і тэхнікай. Пасля вайны аўтар бадзяўся па свеце, плаваў на суднах, будаваў масты... Чым не займаўся! Але і далей не сядзіць, склаўшы рукі, носіць яго па свеце. Сядзім у беластоцкай кавярні „Маршанд", п'ем каву у беласценнай галерэі. Элегантны мужчына прыкурвае цыгарэту, спачатку адарваўшы муштук: „П'ю без фільтра, палю без фільтра ды кахаю без фільтра!". Навучыўся так на караблях.

— Пабачыць мяне маглі ў Сан-Антоніо з самбрэра на галаве і доўгім *cigarillo* ў вуснах, як працую пры пабудове маста. Спаткаць мяне можна было ў Токіо, як маклера суднаплаўнай лініі, як ем рыс палачкамі, ці пад гарачым небам Аргенціны, дзе лес валю ці гадую жывёлу. Як ламаю „чорныя дыяменты" ў шахтах Францыі ды Бельгіі. Як працую ў фабрыках заморскай Англіі... Як займаюся алімпійскімі справамі. З 1955 года — я грамадзянін Даніі. Сыны ў мяне два: Стэфан — маёр і Ян — кіраўнік падаткавай канторы. А ўспамінаецца мне ўсё Беласток. Таму і прыязджаю...

Успамінаецца...

— Было, гэта, вось, у 1926 годзе. Толькі вярнуўся дахаты пасля купання ў Бажантарцы, як маці папрасіла мяне, каб пайшоў па грыбы ў Гарадняны. Паклікаў я свайго добрага сябра Генікa Радзевіча і пабеглі з кошыкамі ў гараднянскі лес. Мелі шчасце, назбіралі сыраежак, розных бэтак і падбярозавікаў. Калі выйшлі з лесу на чыгуначны шлях, убачылі, як гарыць вёска Старасельцы. Бачылі, як у ліпнёвым гарачым сонцы пад напорам жару страляюць саламяныя стрэхі, раскідаючы палаючую салому на суседскія будынкі. У вёсцы апоўдні было мала мужчын, бо пераважна былі на працы. Жанчыны і дзеці ратавалі што

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

маглі з палаючых будынкаў. „Ратуйце свіней!" — крычала адна жанчына. Мы з Генікам кінуліся ў хлеў, дзе квічалі ашалелыя свінні, не могучы пакінуць свайго месца. Мы вывалакалі іх па адной, а яны з віскам вярталіся ў хлеў. Найбольш лямантавала свінаматка. Я ўдарамі нагой у зад прабаваў яе выгнаць, каб пабеглі за ёю парасяты. Быў ужо на парозе хлява, як упаў на мяне палаючы дах. Прываліла мой карак гарачая бэлька. Жанчыны з Генікам вывалаклі мяне, крычаўшага дзікім голасам, з-пад бэлькі. Асмалены, апалены, забыўся я і на грыбы, папёр дадому, здзіраючы на сабе смылячую скуру. Дома мамы не было, але, чуючы мае енкі, збегла з гарышча наша суседка, пані Астроўская, схапіла мяне за руку і пабегла да найбліжэйшага, Жыдоўскага шпіталя па Ліпавай вуліцы. Ой, памятаю дні поўныя болю. Найбольш балела пры перавязках. Праз пару дзён дазволілі прыйсці да мяне рэдактару і фатографу з газеты „Echo Białostockie", паразмаўлялі яны са мною і Генікам, які штодзень прыходзіў да мяне ў бальніцу. Пасля прынеслі нам экземпляр газеты, дзе пад загалоўкам „Bohaterzy ze wsi Starosielce" была апісана наша дапамога ў ратаванні маёмасці і ўбачылі сябе: я — увесь у бінтах, відаць было толькі вочы, рот і нос, а Генік з бінтом на правай руцэ і з асмаленымі валасамі. Пасля выхаду з бальніцы, дзе трымалі мяне тры тыдні і калі Старасельцы сталі памаленьку адбудоўвацца, пазбываючыся саламяных стрэх, мяняючы асабліва на жылых дамах салому на чарапіцу, хадзілі мы часта ў той бок, здабыўшы новых сяброў. Гулялі мы, скакалі па свежацясаных, пахучых жывіцай бэльках, а матулі запрашалі нас на міску супу ці кіслае малако. Да сёння ў мяне памятка на караку і на правым плячы па пажары ў вёсцы Старасельцы. Будучы ў Беластоку, наведаў я тыя Старасельцы, якія трывалі ў маёй памяці. Ішоў асфальтаванай вуліцай, і прыгадвалася мне старая, даваенная вёска, са студнямі ля платоў. Быў у развілцы вуліц, там, дзе звалілася на мяне палаючая бэлька. Тамака ўсё цяпер інакш... Спытаўся я ў мужчыны майго веку, што сядзеў на лавачцы, ці пяматае той пажар. Але аб нас, „героях з вёскі Старасельцы", не памятаў ён нічога...

Міра Лукша

Дзядзькіквасаўскі падарунак

12 жніўня музейным „Рафікам" мы ездзілі да дачкі і зяця Дзядзькі Кваса ў Малынку. Мы — гэта дырэктар Гайнаўскага беларускага музея Янка Карпюк, Аляксей Харкевіч, Янка Ляшчук, які хвацка правёз нас па дарогах і бездарожжах, і я, ніжэйпадпісаны. А ездзілі мы туды па дзядзькіквасаўскую культурную спадчыну — бібліятэку, якую перадалі нашаму музею ягоныя наследнікі.

Сама вёска Малынка выклікала ў мяне сумныя рэфлексіі. Людзей там не відаць, смеху-песень не чуваць. З усіх бакоў дружна наступаюць на яе лес ды бур'яны. Праехалі мы ўсю вёску і ўбачылі толькі двух пажылых людзей, і яны на выгляд гарадскія.

Сядзіба Міхася Красоўскага, вядомага пад ніўскім псеўданімам Дзядзькі Кваса знаходзіцца за вёскай, у полі. Аколіца там цудоўная, але трапіць туды няпроста. Панадворак і будынкі яго хутарка традыцыйныя, нашы, але прыгожыя, дагледжаныя. Па ўсім відаць, што жывуць там людзі гаспадарныя і нябедныя. Значыць, гаспадарка Дзядзькі Кваса трапіла ў добрыя, дбайныя рукі. Разам з традыцыйнасцю нашай, відаць там і новае, сучаснае. У іх садочку, напрыклад, ёсць ужо і альтанка, і штучнае азерца, і прыгожанькі мосцік праз яго, і фантанчык...

А цяпер пра дзядзькіквасаўскую бібліятэку. Проста цяжка паверыць, што звычайны мужык-хлебароб, пражываючы дзесьці на загубленым паміж лясоў, далін і пагоркаў хутарку, меў такія шырокія зацікаўленні і сабраў такую багатую бібліятэку. Ды і час жа, у якім ён жыў, быў вельмі цяжкі і неспрыяльны мужыцкаму бібліяфільству, бо і адукаванасці не хапала, і часу, і кожны грош быў на суровым гаспадарчым уліку. І ўсё ж такі Дзядзька Квас сумеў сабраць такую бібліятэку, якой далёка не кожны інтэлігент можа пахваліцца.

Якіх толькі кніжак там і няма. Сельскагаспадарчыя кнігі, як, напрыклад, агромнае кніжышча „Agrotechnika", на польскай мове ёсць. Польская літаратурная класіка таксама ёсць.

Багата сабрана міжнародная класіка, і яна ў асноўным на рускай мове. Пяць тоўстых тамішчаў „Всемирной истории" и „История Болгарии" таксама на рускай мове. Ёсць яшчэ там балгарскія слоўнікі.

Ёсць духоўная літаратура і літаратура аб рэлігіі. Цэнтральнае месца займае тут, канешне, „Библия", поўнае яе выданне. Але гэтую святую кнігу квасаўскія наследнікі аставілі сабе. І правільна, бо такіх кніг у невядомыя рукі не аддаюць, ды і самім жа трэба часценька чытаць яе.

Аставілі таксама сабе агромністае выданне „Русская советская энциклопедия" і некаторыя іншыя кнігі.

Асноўная аднак частка бібліятэкі была падарана Гайнаўскаму беларускаму музею — усяго 554 кнігі.

Сярод гэтых кніг ёсць яшчэ даволі багаты набор беларускай і беларускай савецкай літаратуры, а таксама творчасці нашых „белавежцаў".

Найбольш аднак кніжак рускай і рускай савецкай літаратуры. Тут і легенды, і казкі, і песні, і летапісы, і геаграфічныя, і гістарычныя атласы, а таксама мастацкая і гістарычная літаратура. Ёсць кнігі добра вядомых рускіх і савецкіх пісьменнікаў, як Пушкіна, Лермантава, Дастаеўскага, Льва і Аляксея Талстых, Чэхава, Шчадрына, Горкага, Маякоўскага, Фадзеева, Шолахава, як і мала знаных. Ёсць кнігі пра Сцяпана Разіна, Емяльяна Пугачова, Кандрата Булавіна, Яна Жыжку. Ёсць „Политическая экономия", „Диалектический материализм" і „Коммунисты" Луі Арагона. І многа, многа другога. Такі шырокі дыяпазон зацікаўлення быў у Дзядзькі Кваса...

Дзядзьку Кваса я знаў толькі па яго ніўскіх артыкулах. Былі яны разумныя, цікавыя і баявыя. Яго баявітасць бралася, відаць, не толькі з яго натуры, характару, але і з характару літаратурных твораў, на якіх ён выхоўваўся. Бо менавіта баявой, бунтарскай літаратуры ў ягонай бібліятэцы найбольш.

Падобных людзей з яго пакалення было ў нас нямала. Гэта было цікавае і вартаснае пакаленне, хаця лёс на іх долю выпаў вельмі цяжкі, суровы. Другой характэрнай рысай гэтага пакалення было тое, што выхоўваліся яны на ўзорах рускай літаратуры і рускіх нацыянальных вартасцях. Значыць і арыентаваліся на іх. Хаця яны і дасканала не валодалі рускай мовай, але даволі добра разумелі яе. Было гэта ўжо апошняе пакаленне нашых беларусаў такім спосабам выхаваных і з такім складам мыслення.

Нашы наступныя пакаленні апынуліся ў зусім іншай палітычнай сітуацыі і паступова пачалі адыходзіць ад арыентацыі на дзедаўскія вартасці і штораз мацней зрастацца з польскімі літаратурнымі ўзорамі ды дзяржаўна-нацыянальнымі вартасцямі. Унукі квасаўскага пакалення ўжо напэўна не будуць чытаць усяго таго, чым зачытваўся Дзядзька Квас і яго пакаленне.

Пераарыентацыя наступала пад уздзеяннем новай, паслякастрычніцкай палітычнай сітуацыі і спосабу паказу ў Польшчы ўсяго рускага, расійскага і іх нацыянальных вартасцей. Паказваюцца яны часта неаб'ектыўна, а нават іранічна, варожа. Не без віны тут, канешне, і самі расіяне, а ў асноўным расіяне-саветы са сваёй неразумнай, антынароднай палітыкай, якая паадпіхала ад сябе ўсе іншыя народы і нацыі. Усё гэта, безумоўна, адбівалася на выхаванні і нашых новых пакаленняў.

Свядомых польскіх беларусаў моцна крыўдзіць таксама русіфікацыйная палітыка ў Беларусі.

Паявілася ў нас добрая мода перадаваць прыватныя архівы, бібліятэкі ці часткі іх у Гайнаўскі беларускі музей. Ужо перададзены кнігазборы Мікалая Гайдука, Дзядзькі Кваса і многіх іншых. Там яны не прападуць і не будуць забыты, а выкарыстаны нашымі ж людзьмі.

Васіль Сакоўскі

Балаховіч і беларуская пагроза

Пры канцы ліпеня 1921 г. у Вільні польскай паліцыяй быў арыштаваны генерал Язэп Балаховіч, брат Станіслава, удзельнік польска-савецкай вайны 1920 г. Разам з Балаховічам палякі арыштавалі 11 афіцэраў саюзнага беларускага корпусу, у тым палкоўнікаў Уладзіміра Лесабодскага і Мікалая Голубева, маёраў Паўла Аксакава і Вацлава Ніцэеўскага.

Пасля заканчэння польска-савецкай вайны саюзныя беларускія і ўкраінскія атрады былі інтэрнаваны палякамі. Праз некалькі месяцаў салдатаў і афіцэраў пускалі на свабоду без ніякага сацыяльнага забеспячэння. Большасць з іх не мела куды вяртацца. Афіцэры ад маладых гадоў найчасцей прабывалі на вайне і не надта ўмелі рабіць нешта іншае чым быць на вайсковай службе. Такі быў таксама лёс арыштаваных у Вільні беларускіх афіцэраў. У іх былі сем'і і ніякіх сродкаў на іх утрыманне. Як беларусы знаходзіліся пад пастаянным кантролем паліцэйскіх службаў. Польскім ветэранам савецкай вайны дзяржава забяспечвала нейкія прывілеі ў выглядзе кавалка зямлі ці месца працы на дзяржаўнай службе.

Вясной 1921 г. канфідэнт, які ў паліцыйных дакументах выступаў як нумар 46 і падпісваўся „Pbc", даслаў шэфу віленскай агентуры рапарт, інфармуючы, што афіцэры былога корпуса Станіслава Балаховіча ствараюць трохтысячны атрад з мэтай атакі на Літву ці Савецкую Беларусь. Якую дзяржаву мелі яны атакаваць „Pbc" не быў упэўнены. Атрад беларускіх авантурыстаў меў узначаліць генерал Язэп Балаховіч. Канфідэнт, спасылаючыся на размову з палкоўнікам Лесабодскім, інфармаваў, што акцыя праўдападобна арганізуецца па жаданні нямецкіх улад, якія імкнуліся выклікаць канфлікт на ўсходзе Польшчы, каб адвярнуць увагу Францыі і Англіі ад праблемы польска-нямецкага памежжа. Частыя сустрэчы ў прыватных кватэрах Язэпа Балаховіча з Лесабодскім, Голубевым і іншымі афіцэрамі прывялі камадаванне паліцэйскіх службаў да перакананння, што сапраўды рыхтуецца нейкая палітычна-вайсковая авантура.

Ген. Станіслаў Балаховіч (пасярэдзіне) і ягоны штаб

Чарговыя рапарты ад агентаў і канфідэнтаў, якія сачылі за падазронымі ўдзень і ўночы прыносілі шмат супярэчных інфармацый. „Pbc" далей пісаў пра нямецкую інтрыгу і фінансаванне Берлінам стварэння вялікага беларускага атрада, аднак не было следу арганізацыі якога-небудзь войска. Іншыя агенты паліцыі пісалі, што калі нават Балаховічам рыхтуецца нейкая акцыя, тады выключна з мэтай рабунку нейкай маёмасці на тэрыторыі Літвы ці Савецкай Беларусі. Падкрэслівалася, што беларускія афіцэры апынуліся ў бязвыхадным сацыяльным становішчы. Генералы і палкоўнікі фактычна маглі займацца жабрацтвам, каб пракарміць сваіх жонак і дзяцей. Пасля арышту афіцэраў Балаховіча нават канфідэнт „Pbc" напісаў, што займаліся яны ў асноўным кантрабандай, каб толькі неяк пражыць. Віленскія ўлады трымаліся аднак канцэпцыі вайскова-палітычнага загавору.

Сацыяльнае становішча былых афіцэраў корпуса Станіслава Балаховіча прывяло іх нават да таго, што прапанавалі палякам свае вайсковыя паслугі на Шлёнску, дзе мелі выступаць у ролі мясцовых паўстанцаў супраць нямецкага панавання.

У жніўні нямецкі след планаванай акцыі Язэпа Балаховіча быў ужо настолькі неверагодны, што нават у Вільні не ўспрымалі яго сур'ёзна. З'явіўся затое ў паліцэйскіх рапартах новы загавор з удзелам арыштаваных. Гэтым разам не немцы, але правадыр рускіх эмігрантаў Барыс Савінкаў меў прафінансаваць армію, якая рыхтавалася выклікаць закалот за ўсходняй мяжой. Міністэрства замежных спраў Польшчы ад свайго дэлегата ў Вільні атрымала нават інфармацыю пра суму 250 мільёнаў польскіх марак, якімі распараджаўся Балаховіч. За гэтыя грошы меў ён паслаць на Міншчыну 1 800 салдат і выклікаць вайну з саветамі. Мелі яны прабываць там ад паловы 1921 г. і чакаць адпаведных загадаў. У падрыхтоўцы гэтай акцыі меў удзельнічаць таксама эміграцыйны беларускі ўрад Вацлава Ластоўскага і беларускія дзеячы з Польшчы.

Беларускае паўстанне супраць саветаў мела праходзіць паралельна з паўстаннем супраць Польшчы, якое рыхтаваў Ластоўскі ў паразуменні з нямецкім і літоўскім урадамі. Каб не дапусціць да вайны паліцыя арыштавала ў Вільні 50 беларусаў, абвінавачваючы іх у арганізацыі антыпольскага падполля, выдаванні нелегальных газет на беларускай мове, планавай дэмаралізацыі польскага грамадства за замежныя грошы, прапагандзе кампраметуючай польскую ўладу. Усе палітычныя клопаты на Віленшчыне былі, паводле мясцовых улад, вынікам беларускага руху, выступаючага як агентура нямецкіх, літоўскіх і савецкіх цэнтраў.

Арышты беларусаў былі праведзены па загадзе старшыні Часовай камісіі па справах Сярэдняй Літвы Аляксандра Мэйштовіча. У 1927 г. па яго ініцыятыве, выступаючага тады як міністр юстыцыі, была ліквідавана Грамада. У лютым 1922 г. варшаўскі ўрад загадаў, аднак, вызваліць з турмы ўсіх беларускіх дзеячаў. Урад паясняў Мэйштовічу, што яго дзеянне пагражае кампраметацыяй польскай дзяржавы ў Еўропе за праслед нацыянальных меншасцей. Пару гадоў пазней ніхто ўжо на такія дробязі як кампраметацыя дзяржавы за праслед нацыянальных меншасцей не звяртаў увагі. Меншасці ў Еўропе былі дзеля таго, каб іх праследаваць. Толькі ў час II сусветнай вайны паказалася як памылковай была такая філасофія палітыкі.

Яўген Міранович

Як я вяртаўся дамоў

Успамінае Мікола ЦЭТРА (1917 года нараджэння) з Тапаркоў — удзельнік абарончай вайны 1939 года.

— У лютым 1939 года быў я прызваны ў армію, у VII Дывізіён зенітнай артылерыі ў Торуні. У пачатку вайны нямецкія самалёты надляцелі над Грудзёндз і збамбілі чыгуначны вакзал. Разбілі таксама нашы зенітныя гарматы. Бомба забіла нашага паручніка, а аднаму салдату паадрывала ногі, многіх параніла. Я ў дыме крыху адбег убок і праляжаў на зямлі да канца налёту. Не заўважыў, што мяне параніла. Толькі афіцэр сказаў мне, што я ўвесь у крыві. Нас, параненых, забралі ў санітарную машыну і завезлі ў бальніцу ў Грудзёндз. Паколькі набліжаўся фронт, доктар пытаў, хто хоча адступаць перад немцамі. Я быў лёгка ранены і рашыўся ўцякаць. Выпісалі мне дакументы і загадалі ехаць у Варшаву. З Грудзёндза выехалі мы на цягніку. Каля Хэлмжы нямецкія самалёты скінулі бомбы на цягнік і мы хаваліся ў полі. Тады я перасеўся на вайсковую грузавую машыну і даехаў у Торунь. Там некалькі дзён быў я ў бальніцы і стаў ізноў уцякаць перад фронтам. Вайсковыя вывезлі мяне за горад і пакінулі, бо дарогі былі занятыя — днём і ноччу ішла пяхота. Уцякалі таксама цывільныя асобы і раненыя. Мне ўдалося ўскочыць ззаду на машыну і пад'ехаць на запасным коле добры кавалак дарогі. Каля Яблоннай войска ляжала ў равах, а самалёты бамбілі амаль бесперапынна. Я тады ў ямкі хаваўся. Афіцэры крычалі да салдат, каб падымаліся, а тыя мёртвыя ляжалі. Адзін бежанец даў мне веласіпед і я ўцякаў па палявых дарогах (па галоўных ішло войска і немцы моцна бамбілі). Заўважыў я, што вайсковыя абкопваліся, выгружалі гарматы і рыхтаваліся да абароны Варшавы.

Не рашыўся я абмінаць Варшаву і вяртацца дамоў, бо апасаўся, што могуць расстраляць за дэзерцірства. Калі дайшоў на зборны пункт у Варшаве, наляцелі самалёты і пачалі бамбіць. Да захаду сонца праляжаў я ў агародзе, толькі асколкі свісталі над галавой. Калі ўсё ўціхла, аказалася, што будынак камандавання разбіты, а салдацкія казармы гараць. Нам, якія пражылі бамбёжкі, далі ўзнагароду за абарону радзімы. Неўзабаве даведаліся мы аб капітуляцыі Варшавы. Афіцэры прасілі нас, каб мы не злавалі і ішлі ў палон. Акружылі нас немцы з аўтаматамі і павялі. Спачатку начавалі мы ў полі, на снапках жыта. Пазней перавялі нас на плошчу нейкага прадпрыемства. Спаў я на вайсковай шынелі, якая з надыходам халадоў прымярзала да зямлі. Давалі нам па кавалку хлеба, але мы ўсё былі галодныя.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вайсковае начальства вырашыла, што палонныя беларусы будуць адпушчаны дамоў. Салдатам-беларусам загадалі ісці пяшком на ўсход. Ішлі мы днём і ноччу і стомленыя дайшлі ў Мінск-Мазавецкі. Там пасадзілі нас у вагоны і павезлі ў Сямятычы. Рускае камандаванне ў Сямятычах пабаялася нас прыняць і паінфармавала, што павязуць у Брэст. Покі везці на ўсход, адвезлі нас у Мінск-Мазавецкі. Было нам холадна і голадна. У мяне пачаў балець жывот і я запісаўся да лекара. Па дарозе ў бальніцу сустрэтыя жыхары Мінска сталі нагаварваць да ўцёкаў. Я адлучыўся ад палонных, пераапрануўся ў цывільную вопратку і пачаў уцякаць. Людзі, якія давалі начлег, пыталі мяне пра сваякоў у войску. Пяшком дайшоў я да Буга.

У вёсцы Кузкі папрасіў я гаспадара перавезці мяне праз Буг. Везці ён апасаўся, толькі паказаў мне як прайсці раку. Я за гэта даў яму грошы, што атрымаў за вайсковую службу. Паляк завёў мяне на ўзгорак, паказаў дзве тычкі і сказаў ісці наўскос ракі, у іх напрамку. Я разбуўся, скінуў вопратку, прывязаў да шыі і ўвайшоў у ледзяную ваду толькі ў бялізне. Стала вельмі холадна і я выскачыў назад. Трэба было ісці каля паўкіламетра і я баяўся, што немцы з непадалёкага моста ўбачаць і заб'юць. Пастаяў я крыху, паразважаў і ўсё ж пайшоў. Быў гэта пачатак лістапада. У ледзяной вадзе здавалася, што цела адлятае кавалкамі, або нехта нажом адбівае. Калі вада памялела, пачаў я бегчы, як лось і ўпаў змучаны на беразе. Стала мне вельмі цёпла і я, скінуўшы мокрую бялізну, пачаў пераапранацца ў сухую вопратку. На дарозе спаткаў рускае войска. Каля дарогі былі надпісы „Здравствуйте". У Сямятычах было многа рускага войска і жыдоў. Вельмі хацелася дамоў. Калі на світанні выйшаў я з Сямятыч, то ўжо вечарам у маці ў Тапарках быў.

Запісаў Аляксей Мароз

Галоўная мэта Цэнтра — заахвочванне студэнтаў да працы на карысць развіцця дэмакратыі ў Беларусі, шырэнне беларускай культуры, мовы і ведаў аб Беларусі...

bkac.republika.pl

Жаданне не толькі больш ведаць аб Беларусі, але нешта рабіць на яе карысць часта становіцца жыццёвай патрэбай. У выніку такога жадання паўстаюць розныя грамадскія арганізацыі, мэтай дзейнасці якіх ёсць прапаганда культуры і мовы беларусаў. Аб адной з такіх арганізацый, а дакладней аб яе прысутнасці ў Інтэрнэце мы сёння пагаворым. Гэта будзе тычыцца Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў Познані.

Набраўшы адрас http://bkac.republika.pl, карыстальніку адкрыецца кідкае жоўтае выяўленне з эмблемай Цэнтра на аранжавым фоне пасярэдзіне. Уверсе назва арганізацыі на трох мовах беларускай, польскай і англійскай. Вакол прамавугольніка, у якім змешчана эмблема, знаходзяцца выхады да рубрык сайта. Іх усяго восем, але кожная лёгка адкрываецца, прычым даволі хутка.

Унізе галоўнай старонкі размешчаны рэпрэзентацыйны тэкст, які раскрывае нам сутнасць, задачы і мэты дзейнасці Цэнтра. Ягоны змест таксама падаецца на трох вышэйзгаданых мовах. Як пішуць арганізатары, галоўная мэта Цэнтра — заахвочванне студэнтаў да працы на карысць развіцця дэмакратыі ў Беларусі, шырэнне беларускай культуры, мовы і ведаў аб Беларусі ў акадэмічным асяроддзі Познані, сярод палякаў і замежнікаў, прамоцыя Беларусі ў Еўропе і дэмакратычным свеце, а таксама спрыянне стварэнню будучых, добра адукаваных элітаў Беларусі.

Цяпер прашпацыруем па рубрыках і пачнем з „Навінаў". Яны падаюцца ў крыху нязвыклым парадку. Першай ідзе не апошняя, а менавіта першая навіна, праўда, даволі істотная, якая паведамляе, што сайт запрацаваў 13 мая мінулага года. Дарэчы, менавіта мінулага года тычыцца большасць паведамленняў. Селетніх усяго дзве, і тыя за студзень. Гэта сведчыць пра тое, што ўладальнікі сайта цяпер не надта клапоцяцца пра абнаўленне свайго твора.

У рубрыцы „Кантакт" падаюцца электронныя адрасы двух ідэйных натхняльнікаў і кіраўнікоў навукова-асветніцкага цэнтра Віталя Воранава і Яўгена Сеня.

Далей ідзе рубрыка „Статут", дзе маем магчымасць пазнаёміцца з галоўным дакументам арганізацыі, больш падрабязна для сябе раскрыць яе верагодны патэнцыял. Статут падаецца толькі на польскай мове.

У „Гісторыі" з усіх запісаў найбольш значным для Цэнтра з'яўляецца леташняе святкаванне Дня Волі. Гэтай падзеі аддадзена амаль палова ўсяго размешчанага на гэтай старонцы тэксту. У наступнай рубрыцы „Здымкі" можна бачыць фатаграфіі выключна гэтага святкавання ў Познані.

Адной з найбольш цікавых старонак ёсць рубрыка „Праекты". У ёй арганізатары і лідэры Цэнтра распавядаюць аб сваіх планах і намерах па дзейнасці арганізацыі. Па іх сцвярджэннях, хутка з'явіцца магчымасць „сцягнуць" пераклад падручніка па беларускай мове, каб ёй маглі навучацца палякі. На жаль, мне зрабіць гэтага не ўдалося — сайт „Гавары са мной па-беларуску" прадстаўлены толькі ў варыянце для рускамоўных навучэнцаў.

Рубрыка „Гасцёўня" прадастаўляе магчымасць напісаць нешта кіраўнікам Цэнтра і распрацоўшчыкам сайта. Калі на яе клікнуць, адразу з'яўляецца месца для напісання электроннага ліста.

Апошняя рубрыка „Сябры" падае імёны і прозвішчы тых, хто ўваходзіць у арганізацыю. Сярод іх, зразумела, не толькі беларусы, але тыя польскія студэнты Познані, якім неабыякавая культура і мова суседняга народа.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларусь заняла „свой пачэсны пасад між народамі". Вынікі падводзіць рана, але ўжо вядома, што гэтая алімпіяда стала для беларусаў паспяховай...

Беларусь, беларусы...

„Дачка ветру" і „Бацька ўрагану"

За колькі дзён да завяршэння алімпіяды (на момант напісання гэтага артыкула) можна ўпэўнена сцвярджаць, што Беларусь заняла „свой пачэсны пасад між народамі". Вынікі падводзіць рана, але ўжо вядома, што гэтая алімпіяда стала для беларусаў дастаткова паспяховай. Мы ў другім дзесятку спартовых дзяржаў у свеце, а дасягненні нашых атлетаў гуртуюць нацыю.

Перамога беларускі **Юліі Несцярэнкі** (у дзявоцтве Барцэвіч) у адным з сама прэстыжных спабораў — бегу на сто метраў зрабіла сапраўдны фурор у свеце. Ураджэнка Брэста спыніла больш чым дваццацігадовую гегемонію цёмнаскурых атлетак з-за акіяна. Так што спрынтарскае дасягненне Юліі мае агульнаеўрапейскі маштаб. Некаторыя замежныя сродкі масавай інфармацыі адразу назвалі новую чэмпіёнку „дачкой ветру". Беларуска цяпер сама рэактыўная жанчына свету! На радзіме Несцярэнку чакае грашовая прэмія ў эквіваленце 60 тысяч долараў (столькі атрымае кожны беларус за алімпійскае золата). На гэтыя грошы можна купіць добрую кватэру і машыну, бо да гэтага часу Несцярэнка з мужам (таксама лёгкаатлетам) маюць толькі пакойчык у інтэрнаце.

Ад лёгкай атлетыкі беларускія заўзятары чакалі крыху большага. З-за нядужання была змушана спыніць пасля двух відаў змаганне наша славутая сяміборка Наталля Сазановіч. Чэмпіён свету, кідальнік молата з Гродзеншчыны **Іван Ціхан** быў галоўным фаварытам, але стаў толькі срэбным прызёрам. У гэты дзень беларусы заваявалі **200-ы** медаль (!!!) за ўсю гісторыю алімпіяд. Вольга Цандар, на якую былі значныя надзеі ў кіданні молата, стала шостай. Яшчэ адну алімпійскую бронзу ў сваю капілку паклала чэмпіёнка свету дыскаболка **Ірына Ятчанка** (яна была трэцяй і ў Сіднеі-2000). Гэта поспех, бо яе сяброўка, спрактыкаваная Эліна Зверава не здолела прайсці кваліфікацыю і заняла толькі 15-е месца. Добрым трэба прызнаць выступ у хадзе на 20 км Маргарыты Туравай, якая заняла чацвёртае месца. А вось мужчыны-хадакі ў дзесятку не прабіліся.

Заваяваўшы срэбра ў акадэмічным веславанні, свой высокі клас пацвердзіла першая беларуская алімпійская чэмпіёнка **Кацярына Карстан** (Хадатовіч). Яна здабывае медалі ўжо чацвёртыя гульні запар (!), цяпер у Кацярыны поўная калекцыя алімпійскіх узнагарод — два золаты, срэбра і бронза. Падтрымалі прэстыж айчыннага веславання мазыранка **Наталля Гелах** і мінчанка **Юлія Бічык**, якія сталі трэцімі ў лодцы парнай.

Незадаволенай сваім бронзавым выступам у трэкавым гіце на 500 м засталася пяціразовая чэмпіёнка свету **Наталля Цылінская**. Нашая знакамітая раварыстка хацела завяршыць бліскучую кар'еру алімпійскай перамогай, але фартуна ад яе адвярнулася. Яшчэ больш не пашанцавала Дзмітрыю Палярушу ў скачках на батуце, які быў рэальным прэтэндэнтам на медаль, але стаў чацвёртым.

Сенсацыяй са знакам плюс стаў выступ маладога магілёўскага цяжкаатлета **Андрэя Рыбакова**. У вагавай катэгорыі да 85 кг наш штангіст здолеў апярэдзіць знакамітага грэка Піраса Дзімаса і стаў срэбным лаўрэатам.

Афіцыйная рэакцыя на выступы нашых спартоўцаў пакуль дастаткова стрыманая. „Ацечаственны" алімпійскі Зеўс пакуль абмяжоўваецца віншавальнымі тэлеграмамі. Якой будзе „аналітычная" ацэна „Бацькі ўрагану" сказаць цяжка. Яшчэ ёсць шанцы заваяваць агулам пад 20 медалёў.

Уладзімір Хільмановіч

Народнае апалчэнне дзеля Беларусі

„Асноўныя правы і свабоды павінны захоўвацца таксама ў Беларусі. Усімі сродкамі трэба падтрымліваць развой і ўзмацнянне дэмакратычных сіл у Беларусі для рэалізацыі грамадзянскіх правоў і магчыма як найхутчэйшага стварэння ў Беларусі дэмакратычных інстытутаў улады". Такія фармулёўкі апынуліся ў адкрытым лісце, падпісаным м.інш. праф. Уладыславам Барташэўскім, вядомымі рэжысёрамі Анджэем Вайдам і віцэ-маршалкам Сената Казімежам Куцам, сенатарам і вядомым кардыёлагам Збігневам Рэлігам, гісторыкам Генрыкам Самсановічам. Аўтары паслання пытаюцца рытарычна і кантраверсійна: „Ці мы, палякі, хацелі б ліквідацыі дэмакратычнай дзяржавы, канчатковай русіфікацыі і асіміляцыі беларусаў? Ці мы хацелі б, каб расійскія войскі сталі ля нашых межаў?" Асцерагаюць, што, „рэжым дыктатара Аляксандра Лукашэнкі знаходзіцца ў перманентным крызісе і будзе прымушаны раней ці пазней пагадзіцца з імперыяльнымі задачамі Расіі, і, што за гэтым ідзе, паддаць Беларусь панаванню Расіі". І далей: „Самі беларусы, без дапамогі звонку, не ў змозе вызваліцца з-пад дыктатуры. Доказам гэтага — вопыт Іракa". Канчаюць: „Толькі суверэнная, дэмакратычная, еўрапейская Беларусь будзе бяспечным суседам і добрым партнёрам для Польшчы. Дапамагаючы беларусам — дапамагаем сабе, дапамагаем Польшчы!" Урэшце, заклікаюць „усіх свядомых грамадзян, перакананых прыхільнікаў дэмакратыі" ўключыцца да „Руху — Польшча за дэмакратычныя перамены ў Беларусі".

Ліст гэты апублікавала „Выбарчая газета". Выклікаў ён адразу хвалю дыскусіі і сумненняў. Уключылася „Трыбуна". На яе старонках Казімеж Куц і іншы падпісант ліста Януш Анышкевіч, былы міністр нацыянальнай абароны, сёння віцэ-старшыня Еўрапарламента, выказалі свае адносіны да некаторых спрэчных у ім пытанняў. У першую чаргу — да пытання магчымага размяшчэння расійскіх войск ля польскіх межаў.

— Гэта метафарычная мова, якой гаворыцца аб іншых пагрозах. Не трэба гэтага ўспрымаць літаральна, — кажа Казімеж Куц.

— Расійскія войскі, праўда, стаяць у Калінінградзе, але зусім інакш выглядала б сітуацыя, калі б наступіла пераразмяшчэнне расійскіх войск на Беларусь, — дадае Януш Анышкевіч.

Абодва яны выказваюцца за дапамогай Беларусі знутры, з краін Заходняй Еўропы.

Прафесар Уладыслаў Барташэўскі заначае:

—Не думаю, што любыя публічныя заявы і адкрытыя лісты могуць паўплываць на нейкі непасрэдны вынік. Яны — сігналы, знакі салідарнасці і гатоўнасці да супрацоўніцтва ў нейкіх справах шляхам матэрыяльнай, маральнай падтрымкі, распаўсюджання іншых пазіцый, а таксама нейкага роду пасрэдніцтва ў дзейнасці.

Звяртае, аднак, увагу:

— Усё ж, да грамадзян Беларусі належыць вырашэнне, ці хочуць жыць у суверэннай краіне, ці можа, увогуле не хочуць мець суверэнную дзяржаву, альбо мець краіну ілюзорна суверэнную. Аб гэтым Польшча не будзе вырашаць.

Прэс-інфарматар польскага МЗС Багуслаў Маеўскі выказаўся на тэму ліста:

— Мы робім усё, каб — як і ў двухбаковым, так і шматгранным кантэксце, — выкарыстаць кожную нагоду для падтрымкі і развою дэмакратычных устаноў у Беларусі.

Прытым дадае:

— З-за зразумелага становішча дэмакратыі ў Беларусі, мы не дапускаем магчымасці ўтрымлівання кантактаў на найвышэйшым узроўні.

А зараз жа пасля:

— Абавязак кожнай дэмакратычнай дзяржавы — рашучы пратэст і націск на незахоўванне грамадзянскіх правоў у Беларусі.

На просьбу „Трыбуны" наконт зместу адкрытага ліста выказаўся пасол Рэспублікі Беларусь у Варшаве Павел Латушка. Заяўляе ён м.інш.: „Беларусь гатова ўспрыняць добрую параду, але не будзе дапускаць павучэнняў і падобных акцэнтаў у ацэнцы яе ўнутранай сітуацыі. Няма патрэбы экспартаваць дэмакратыі. У Беларусі працягваецца паслядоўны працэс развою, а яго напрамкі будзе вызначаць толькі беларускі народ". Раней пасол падкрэсліваў: „Падстава палітыкі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі — уласнае імкненне да захавання і ўзмацнення здабытай на пачатку дзевяностых гадоў незалежнасці, ад якое Беларусь не мае намеру адракацца".

Зацікаўленне „Трыбуны" выклікала асабліва тое, хто аўтар ліста, хто яго фармуляваў. Падпісанты, у якіх пыталіся на гэты конт, звязаны м.інш. з Грамадзянскай платформай (было асабліва падкрэслена, што ліст падтрымлівае Ян Марыя Ракіта) і Уніяй вольнасці, не ўпэўнены ў гэтым, але, падобна як праф. Барташэўскі, адказваюць, што падпісалі яго, бо ягоны змест — слушны.

— Існасць зместу — наш клопат, трывога, гатоўнасць да прыязнага садзейнічання.

Мацей Халадоўскі

РЫНАК ПРАЦЫ Ў БЕЛЬСКІМ ПАВЕЦЕ

Працэс эканамічнай трансфармацыі і гаспадарчы спад канца дзевяностых гадоў прычыніліся, так як і ў іншых раёнах краіны, да пагаршэння абставін на рынку працы ў Бельскім павеце. На канец 2003 года ў Павятовай управе працы былі зарэгістраваны 1 477 працягла беспрацоўных — звыш года — асоб. Складае гэта палову ад усяго ліку беспрацоўных; большасці з іх менш за 34 гады.

Паводле інфармацыі Павятовай управы, у канцы мінулага года былі зарэгістраваны тры тысячы беспрацоўных (дзеля параўнання: у ліпені 2001 г. — 3 081). Мера беспрацоўя сягнула 9% працаздольнага насельніцтва (у ваяводстве 14,5%, у краіне 18%).

Праз апошнія чатыры гады лік беспрацоўных пастаянна меншае, разам на 129 асоб. Тэндэнцыя спаду беспрацоўя пераважае ў вясновалетні перыяд, а росту — у восеньска-зімовы. Толькі ў 1999 годзе зафіксавана значны рост ліку беспрацоўных — на 424 асобы.

Сітуацыя жанчын на рынку працы больш складаная чым мужчын: часцей трацяць працу і цяжэй ім знайсці новую. Працадаўцы ахвотней прымаюць на працу мужчын, часта не зважаючы на іх кваліфікацыі і прафесіянальны вопыт. На канец мінулага года ў ліку трох тысяч зарэгістраваных беспрацоўных было 1510 жанчын (50,3%), з чаго ў Бельску 911 асоб, у Браньску 101, у Бельскай гміне 128, Браньскай 76, Вышкаўскай 95, Арлянскай 79, Боцькаўскай 74 і Рудчанскай 46 жанчын. Права на засілак мелі 133 жанчыны; гэта 36,8% усіх асоб, якія карысталіся такога роду дапамогай.

З зарэгістраваных у Павятовай управе беспрацоўных, найбольш мае асноўную прафесіянальную адукацыю, гімназічную і меншую. Найменш беспрацоўных сярод людзей з вышэйшай адукацыяй, нягледзячы на мінулагодні 24-працэнтны рост беспрацоўя ў гэтай групе.

Найбольш беспрацоўных складаюць асобы ва ўзросце 18-24 гады — іх каля 30% усіх беспрацоўных. Невялікі адсотак іх складаюць людзі звыш 55 гадоў.

Беспрацоўе з'яўляецца трывалым фактарам, які адмоўна ўплывае на грамадскую сітуацыю ў павеце. Варта адзначыць, што толькі ў самым горадзе Бельск, дзе найбольш беспрацоўных, амаль палова з іх (759 сем'яў) карыстаецца сацыяльнай дапамогай.

Шанс паправы сітуацыі бельскае староства бачыць у гаспадарчым росце, развіцці прадпрымальніцтва і ўдасканальванні людскіх рэсурсаў.

Гаспадарчая адсталасць не толькі Бельскага павета, але і ўсяго рэгіёна, ды растучы разрыў з рэштай краіны пільна патрабуюць паскарэння эканамічнага росту і паправы канкурэнтаздольнасці павета дзеля стварання новых месц працы і, у выніку, спаду беспрацоўя.

Апрача гэтага патрэбная падтрымка дасканаленню людскіх рэсурсаў шляхам пастаяннага росту прафесіянальнай патрыхтоўкі людзей да патрабаванняў мясцовага рынку працы ды стваранне ўмоў для росту прафесіянальнай мабільнасці насельніцтва. Трэба таксама пасадзейнічаць эканамічнаму развіццю шляхам распаўсюджвання ведаў аб прадпрымальніцтве ды падтрымліваць самазанятасць як адзін з асноўных спосабаў пераадольвання беспрацоўя.

З аналізу абставін на працоўным рынку вынікае, што адміністрацыйную дапамогу трэба найперш аказаць маладым людзям уваходзячым у працаздольнасць, людзям, якім пагражае працяглае беспрацоўе і грамадскае адставанне, жанчынам і тым асобам, якія хочуць павышаць сваю прафесіянальную адукацыю.

Міхал Мінцэвіч

Пажаданні

*З нагоды васьмідзесяцігоддзя **Анне Петручук** з Беластока жадаем шмат здароўя і добрага настрою.*

Марыя і Мікола Федарукі

*

*Здзяйснення ўсяго, аб чым марыш, добрага здароўя і натхнення жадаем Табе, дарагі наш **Валодзя Гайдук** з Тарнопаля, з нагоды Твайго дня нараджэння!*

„Ніўцы" і „белавежцы"

Паломніцтва ў Брэст

Брацтва св. Афанасія Брэсцкага пры Свята-Духаўскім прыходзе ў Беластоку ў днях 17-18 верасня 2004 г. арганізуе паломніцтва ў Брэст на ўрачыстасці ў гонар св. Афанасія. Кошт падарожжа складае 130 зл., у тым віза і начлег у гасцініцы.

Ахвотныя прыняць удзел у паломніцтве павінны мець сапраўдны пашпарт. Пры падачы заяўкі на выезд трэба запоўніць фармуляр на атрыманне візы і прылажыць да яго адну фатаграфію.

Заяўкі прымаюцца ў канцылярыі Свята-Духаўскага прыхода (тэл. 65 32 854), пры свечачным яшчыку і тэлефанічна: 0 606 716 032, 0 502 368 877.

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

• Маладой цырульніцы з вопытам, тэл. 0 606 994 639.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Маладая жанчына, правы кат. В, добрае веданне рускай і англійскай моў, аператыўная, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 692 660 704.

• Маладая жанчына, добрае веданне нямецкай мовы, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 508 753 167.

• Мужчына, 48 гадоў, пільна шукае працу ў Бельску, II група інваліднасці, тэл. 0 604 671 311.

• Жанчына, 37 гадоў, стаж працы ў гандлі, кніжка здароўя, тэл. 0 502 600 565.

• Маладая жанчына без дрэнных схільнасцей заапякуецца дзіцём, вопыт, тэл. 0 602 432 565.

• Жанчына, 43 гады, тэхнічная адукацыя, закончаныя курсы камп'ютэрнага рахункаводства, права працы і экатурызм, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат свабоднага часу, тэл. 730 40 00 (Бельск-Падляшскі).

• Жанчына, 27 гадоў, вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 506 489 040.

• Шафёр, правы кат. А В С, шукае працу на тэрыторыі Падляшскага ваяводства, тэл. 0 605 167 543.

• Малады сталяр шукае працу ў Беластоку, уласная машына, тэл. 743 19 57.

• Абітурыентка рускай філалогіі шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, закончаныя камп'ютэрныя курсы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 732 60 27.

• Маладая жанчына, 24 гады, працоўны стаж у магазіне, добрае веданне нямецкай мовы, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум, правы кат. В, тэл. 0 506 345 798.

• Мужчына, 26 гадоў, працоўны стаж у тэхнічным магазіне, санітарны мінімум, уласная машына, правы кат. В, тэл. 0 604 207 989.

• Студэнтка маркетынгу шукае працу ў Беластоку, працоўны стаж у магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей, тэл. 0 692 687 442.

• Краўчыха з сямігадовай практыкай шукае працу ў Бельску, тэл. 0 502 370 486.

• Аператыўны мужчына, шукае працу ў Беластоку, падставовае веданне нямецкай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. В, тэл. 0 608 210 435.

• Студэнтка ахвотна заапякуецца малым дзіцём, тэл. 0 508 820 414.

• Студэнтка трэцяга курсу польскай філалогі шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 602 769 109.

• Мужчына, 37 гадоў, сярэдняя тэхнічная адукацыя, сумленны, шукае працу, тэл. 0 693 075 252.

• Жанчына, вышэйшая эканамічная адукацыя, абслуга камп'ютэра, добрае веданне англійскай мовы, шукае працу ў Беластоку або Бельску-Падляшскім (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 602 613 878.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, кніжка здароўя, санітарны мінімум, правы кат. В, тэл. 0 607 452 511.

• Мужчына, 28 гадоў, сярэдняя адукацыя, абслуга камп'ютэра, уласная машына, тэл. 0 694 270 600.

• Механік з вопытам прыме кожную прапанову працы ў Беластоку, тэл. 717 70 98.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 720 20 06

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе дзіцячага адзення, пасцелі і яды.

• Адзінокая маці з хворым дзіцём будзе ўдзячная за ўсякую помач.

• Сям'я просіць дапамогі ў выгядзе старой мэблі і адзення для дзяцей ва ўзросце 7, 9, 12 і 13 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і куртак для хлопцаў ва ўзросце 10 і 13 гадоў, ботаў і адзення для 5-гадовай дзяўчынкі.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе штаноў і лёгкіх блузак для хлопцаў ва ўзросце 11 і 9 гадоў, ботаў і адзення для 7-гадовай дзяўчынкі.

• Сям'я патрабуе помачы ў выглядзе яды і гігіенічных сродкаў.

• Сям'я з дзяцьмі ва ўзросце 4, 9, 12 гадоў будзе ўдзячная за любую помач.

• Сям'я патрабуе старога халадзільніка і яды.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры і іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 053 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

У атэлье мастака:

— Не магу наглядзецца на гэтую тваю карціну, — кажа сябра артыста.

— А я ўжо наглядзеўся і ахвотна яе табе прадам.

* * *

Янка прывёў дадому дзяўчыну, з якою толькі што пазнаёміўся. Калі ўжо распрануліся, ён нешта западозрыў і пытае яе:

— Слухай: а колькі табе гадоў?

— Трынаццаць, — прызнаецца дзяўчо.

— Што-о!? Хутка мне апранайся!

— Я не падазравала, што ты такі забабонны...

* * *

У Вігілію ў вёску людаедаў прыходзіць Дзед Мароз з вялікім мяшком. Уваходзіць у першую хату з краю:

— Ледзь дацягнуўся, — сапе, — прынёс вам вялікія падарункі...

— Чорт з падарункамі, — адказвае гаспадар, — будзем мець святочную вячэру.

* * *

Кавальскі выехаў у Амерыку. Праз месяц тэлефануе жонцы:

— Усё ў парадку: знайшоў працу. І вельмі блізка — няпоўных трыццаць мінут язды!

— Трамваем?

— Не, ліфтам.

* * *

Трох неграў злавіла залатую рыбку. Рыбка абяцае ім, што споўніць кожнаму па адным жаданні.

— Хачу быць белым, — гаворыць першы і становіцца белым.

— Хачу быць белым, — гаворыць другі і таксама ім становіцца.

— А я, — смяецца трэці, — хачу, каб яны пачарнелі назад.

* * *

— Ці гэта праўда, што жанчыны жывуць даўжэй за мужчын?

— Так, асабліва ўдовы.

Веру ў ЕС

Ці там сядзець, ці там, панове,
склаўшы рукі на падоле,
ці мо паверыўшы ў тое,
што будзе лепей а не горай,
як з маёй рыфмай у гэтым вершы
(як пра мастацкасць, дык я першы
змагацца буду за Еўропу!);
сярод пітэкантрапаў, халопаў
я прапаведаваць ідэю
Вам, людцы добрыя, пасмею.
Я не адзін, я голас маю
парламентарыя ад краю —
ён прадстаўнік (лепш прадстаўніца) —
за нас павінна заступіцца.
Я, Толік Кролік — што за нацыя?
Хто мае весціць маю рацыю?
Ці мо засее, заарэ
ды плён з палёў маіх збярэ,
камбайнам з'ездзіць па палетках,
каб мне жылося гладка, летка?
Ці, можа, лепей структуральна,
(па-еўрапейску — як? ... анальна?!),
нармальна, кажаце — нар-маль-на! —
Здам хату, коніка і поле
ды буду еўрапейцам болей
чым сам Мацейка Халадоўскі,
цяпер больш захадні, чым польскі.
Вокам я бачу, чую вухам
тое, што можна бачыць, слухаць.
Каму чытаць — няхай чытае,
часу калі яму хапае,
граша на „Ніву" не шкадуе;
таму ў Еўропе пашанцуе!

Толік Кролік

Фота БАГУСЛАВА СКОКА

Музычная размова

Гурт „Б.Н.", дакладней кажучы — „Без Назвы", сёлетняе „Басовішча" наведаў ужо чацвёрты раз. Гутару з Алесем ЛЮТЫЧАМ.

— У бліжэйшы час не думаеце знайсці, усё ж такі, сабе назву?

— Не! Гэта ж і ёсць наша назва — „Без Назвы".

— А як „Басовішча"?

— З кожным годам усё лепш. Падабаецца афармленне сцэны, арганізацыйныя пытанні і публіка. Класна!

— „Б.Н." гэта адзін з нямногіх гуртоў з-па-за Мінска...

— Мы з мястэчка Бяроза Брэсцкай вобласці. У нашым гарадку 25-30 тыс. жыхароў. Не толькі Мінск можа ствараць добрую музыку, таму што Беларусь гэта не толькі адзін Мінск.

— У якім музычным жанры іграе „Б.Н."?

— Паколькі наш гурт „Без Назвы", мы іграем музыку, якая нам атрымліваецца. Гэта справа крытыкаў як нас назавуць. Мы імкнемся рабіць добрую музыку, якая „каўбасіць" народ.

— У такім выпадку хаця раскажы пра што спяваеце?

— Нашы песні ў асноўным пра каханне, каханне да ўсяго: да жанчыны, мужчыны, радзімы.

— А да ката?

— Так, да жывёл таксама. Мы не абмяжоўваемся адной тэмай.

— Зараз моцна прамуецца ваша песня „Толькі я"?

— Гэта адна з першых беларускіх нашых песень. Сяржук Машковіч, які зараз у войску, напісаў словы, а я — музыку. Памятаю, як у 1999 годзе мы яе рэпетыравалі ў гаражы, калі не было яшчэ слоў. З гэтага мы і пачалі спяваць па-беларуску.

— Ці ў Беларусі ёсць запатрабаванне на беларускамоўную музыку?

— Я лічу што ёсць. Тое, што адбываецца на канцэртах, сведчыць, што народу падабаецца вельмі. Трэба рабіць, рабіць, рабіць і нешта добрае ў тым накірунку напэўна будзе.

Гутарыў Татка Стэп

Музычныя навіны

Аляксандр Крывашэеў „Памідораў" аб'явіў на сваім сайце http://pomidoroff.net, што пакрысе праяўляецца агульны канцэпт новага альбома (праграмы). Дакладна будзе 13 песень. Запіс пачнецца ўвосень. Чакаем. Першы альбом „Сьвята пакрадзенае" з'явіўся ў 2001 годзе і пісаўся з 1997 года. У спецыяльным выданні, між трэкамі, можна было пачуць жыхароў Беластока.

Першы альбом гурту „Індыга" быў запісаны ў студыі Беластоцкага радыё. Такім чынам група адпрацавала свой прыз на „Басовішчы-2003", у адрозненні ад некаторых мінулагодніх лаўрэатаў, якія такім падарункам так і не пакарысталіся. У напісанні тэкстаў вакалістцы Марусі дапамог Андрэй Хадановіч. На бэк-вакале гэтай кампазіцыі можна пачуць і гурт „Тарпач".

Татка Стэп

Адгаданка

В	А	Н
Е	♍ ♎	Е
Р	Ь	С

Рашэнне прачытаецца за адзін праход шахматнага каня, пачынаючы ад падкрэсленай літары. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 30 нумара

Авёс, бацька, вуха, дзот, дым, Каба, кум, лёс, міг, мох, моц, муж, ніць, сені, тып, цень, цеста, Ціса, цыяноз, чын.

Рашэнне: **Каб стаць славутым, часам хопіць імгненне, каб астацца нікому невядомым — зыходзіць усё жыццё.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

5.09 – 11.09

Баран (21.03. — 19.04.) 8 — 12.09. будзеш нецярплівы, нават агрэсіўны. Лёгка будзеш уваходзіць у канфлікты з атачэннем. Старайся паводзіць сябе памяркоўна, халаднакроўна. Нічога на сілу! Хіба што хочаш набіць сабе гузак.

Бык (20.04. — 20.05.) Можаш нават выйграць немалыя грошы на латарэі, але не будуць яны цябе трымацца. Нестабільныя фінансы. Увесь месяц рыхтуецца паспяховы. Каханне стукае ў дзверы...

Блізняты (21.05. — 21.06.) Блізка цябе здаўна ёсць хтосьці, хто табе закруне ў галаве. Можаш ісці праз жыццё прабойна, не аглядаючыся за сябе. Зацяжкае партнёрства можа распасціся.

Рак (22.06. — 22.07.) Знакамітая пара на прызнанні, шлюбы, дараванне здрад. Не бойся новых выклікаў, шчасце цябе не пакіне. Усё, што здарыцца ў гэтым месяцы — карыснае для цябе, хоць здасца спачатку нават трывожным.

Леў (23.07. — 22.08.) 7.09. Венера перасоўваецца ў твой знак — гармонія, раўнавага, час на раманы, сустрэчы з сябрамі, хобі. Калі Сонца створыць квадратуру з Плутонам (з 10 аж да 14.09.), акалічнасці змусяць цябе да ўвядзення змен, на якія не будзеш мець ахвоты. Уцягнуць цябе ў непрыемныя сітуацыі, але выберашся з іх без страт.

Дзева (23.08. — 22.09.)З 10.09. Меркурый напоўніць цябе пазітыўнай энергіяй. Удасца табе наладзіць новыя знаёмствы, аформіць адпушчаныя справы. Спрытна абмінеш усе праблемы. У гэтым месяцы прадбачваецца сур'ёзны пералом, які прынясе табе шмат добрага.

Шалі (23.09. — 23.10.) Можаш пакінуць за сабою нядобрыя сувязі і працу, якая табе перастала падабацца. Такія неабмежаваныя магчымасці, як у гэты верасень, зоркі запрапануюць табе раз у 12 гадоў!

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Маеш шанц адчуць амаль метафізічную сувязь з партнёрам. 6 — 9.09. узрастуць твае амбіцыі, развінеш свае ўмеласці і таленты. З 9.09. (аж да 14.09.) старайся не фарсіраваць сваіх поглядаў на сілу, пазбягай людзей, якія схочуць цябе здамінаваць. Можа чакаць цябе несправядлівая ацэнка, зганьбаванне ці прыкрая плётка.

Стралец (22.11. — 21.12.) Спадзявайся незвычайных доказаў любові! Радыкальныя прафесійныя рухі будуць цяпер найбольш карыснымі. Цалюткі месяц — аптымістычны, радасны, шчаслівы.

Казярог (22.12. — 20.01.) Нечакана атрымаеш грошы, якіх зусім не спадзяешся. Найбольш прыдаліся б табе: шалёнае каханне і сапраўдны адпачынак. Не забудзь наведаць стаматолага.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Маеш цяпер ахвоту здабыць фартуну ці выйграць вялікія грошы. Зробіш на кімсьці вялікае ўражанне, але добра падрыхтуй сустрэчу. З 7.09. твае адносіны з атачэннем — вельмі гарманічныя, пазнаёмішся з мілымі людзьмі, можаш спаткаць любоў свайго жыцця.

Рыбы (20.02. — 20.03.) У гэты раз не ўцячэш ад любові ці нават шлюбу. За што возьмешся (увесь месяц!) — усё выкліча захапленне. Інтэнсіўныя і шматлікія кампанейскія кантакты.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960